# ПРАПАГАНДА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў МАСАВЫХ БІБЛІЯТЭКАХ РЭСПУБЛІКІ

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА
ЧЫРВОНАГА СЦЯГА БІБЛІЯТЭКА БССР
імя У. І. ЛЕНІНА

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА

# ПРАПАГАНДА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў МАСАВЫХ БІБЛІЯТЭКАХ РЭСПУБЛІКІ

(Метадычныя парады)

Мінск
1986

ББК 78.38

**Прапаганда** беларускай літаратуры ў масавых біб-
П69 ліятэках рэспублікі: Метад. парады /Дзярж. б-ка БССР імя У. І. Леніна; Склад. М. У. Сокал.—Мн., 1986.—51 с.

**У брашуры разглядаюцца асноўныя напрамкі і асаблівасці індывідуальнай і масавай прапаганды беларускай літаратуры, даны матэрыялы для правядзення асобных мерапрыемстваў.**

Складальнік М. У. Сокал
Рэдактар М. А. Каваленка

**(С) Дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга бібліятэка БССР імя У. І. Леніна, 1986**

## ПРАПАГАНДА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ У МАСАВЫХ БІБЛІЯТЭКАХ РЭСПУБЛІКІ

У новай рэдакцыі «Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза», прынятай XXVII з'ездам КПСС, гаворыцца, што «КПСС надае вялікае значэнне больш поўнаму і глыбокаму асваенню працоўнымі масамі багаццяў духоўнай і матэрыяльнай культуры, актыўнаму далучэнню іх да мастацкай творчасці. Паслядоўна кіруючыся ленінскімі прынцыпамі культурнага будаўніцтва, партыя будзе клапаціцца аб эстэтычным выхаванні працоўных, падрастаючых пакаленняў на лепшых узорах айчыннай і сусветнай мастацкай культуры»*.

У паспяховым вырашэнні гэтай задачы асобая роля належыць літаратуры, якая прызвана служыць інтарэсам народа, справе камунізму, адлюстроўваць волю, пачуцці і думкі мільёнаў людзей, актыўна дапамагаць іх ідэйнаму абагачэнню і маральнаму выхаванню.

Неад'емнай састаўной часткай савецкай культуры з'яўляецца літаратура Савецкай Беларусі. Яна ўносіць вялікі ўклад у скарбніцу духоўных каштоўнасцей краіны.

Шлях беларускай літаратуры да самастойнага развіцця быў вельмі складаны і нялёгкі, як і сама гісторыя беларусаў. Доўгае знаходжанне на скрыжаванні войнаў адмоўна ўплывала на літаратурны працэс, запавольвала яго, а таксама з'явілася прычынай таго, што многія творы літаратуры мінулых часоў беззваротна загінулі, ці яшчэ не знойдзены. Спадчыну, створаную нашымі далёкімі продкамі, часта прысвойвалі то польскія магнаты, то ідэолагі рускага самадзяржаўя. Царскі ўрад наогул не прызнаваў за беларускім народам права на нацыянальную культуру, адмаўляў існаванне беларускай мовы, забараняў друкаваць на ёй кнігі.

Аднак, нягледзячы на неспрыяльныя гістарычныя ўмовы, беларускі народ на працягу шэрагу стагоддзяў стварыў багатую мастацкую літаратуру, якая за гады Савецкай улады вырасла ў адну з перадавых літаратур Савецкага Саюза. З важ-

* Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Новая рэдакцыя.— Мн., 1986, с. 56.

кімі творчымі поспехамі падышла наша літаратура да IX з'езда пісьменнікаў Беларусі, які адбыўся ў красавіку 1986 года. Як і літаратура ўсіх другіх народаў нашай краіны, яна мае вялікае пазнавальнае, выхаваўчае і эстэтычнае значэнне і выступае магутнай сілай у камуністычным выхаванні працоўных.

Глыбокая і ўсебаковая прапаганда лепшых твораў беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца адной з першачарговых задач масавых бібліятэк рэспублікі. Сёння ў іх фондах налічваецца каля 15 млн. кніг на беларускай мове, большасць якіх складае беларуская мастацкая літаратура. У рэспубліцы праводзіцца пэўная работа па яе прапагандзе. Бібліятэкі, як правіла, адзначаюць юбілейныя даты пісьменнікаў, праводзяць мерапрыемствы па асобных творах, задавальняюць запатрабаванні чытачоў. Аднак у цэлым пастаноўку работы ў гэтым напрамку пакуль што нельга лічыць задавальняючай. Як адзначыў у сваім выступленні на IX з'ездзе пісьменнікаў Беларусі першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі М. М. Слюнькоў,— «не ўсе рэзервы выхаваўчага, ідэалагічнага ўздзеяння літаратуры на шырокія масы людзей вычарпаны»*.

У дзейнасці па актывізацыі і ўдасканаленню прапаганды беларускай літаратуры ў першую чаргу павінна рэалізавацца партыйнае патрабаванне комплекснага падыходу да пастаноўкі работы, якое неабходна ўлічваць як пры вызначэнні напрамкаў прапаганды, так і пры выбары форм, метадаў і сродкаў, з дапамогай якіх яна будзе ажыццяўляцца.

Непасрэдныя адносіны да бібліятэк мае таксама пастаўленая партыяй сур'ёзная задача перабудовы ідэалагічнай работы, у сувязі з чым ім трэба дабівацца, каб змест прапаганды стаў больш актуальным, каб вялася яна ажыўлена і цікава, а формы адказвалі сучасным запатрабаванням савецкіх людзей.

### Вывучэнне інтарэсаў чытачоў

Прапаганда беларускай літаратуры пачынаецца з вывучэння інтарэсаў чытачоў. Як вядома, састаў чытачоў беларускай літаратуры вельмі неаднародны. Сярод іх людзі розных узростаў і прафесій, з рознымі густамі і запатрабаваннямі. Адны звяртаюцца да беларускай літаратуры ў сувязі з вучобай ці прафесійнымі інтарэсамі, другія — таму што любяць

* Звязда. 1986. 25 крас.

чытаць мастацкую літаратуру наогул і беларускую ў прыватнасці.

Выявіць чытачоў беларускай літаратуры, іх састаў, інтарэсы і запатрабаванні ў кожнай канкрэтнай бібліятэцы можна з дапамогай аналізу фармуляраў, гутарак, назіранняў, анкет і г. д.

Прапаганда літаратуры патрабуе ў ліку асаблівасцей кожнай групы адбору для іх патрэбных, цікавых і лепшых у ідэйна-мастацкіх адносінах кніг, правільнага выбару форм і метадаў работы.

Ва ўсіх бібліятэках, безумоўна, будуць тыповыя групы чытачоў беларускай літаратуры. Перш за ўсё гэта выкладчыкі беларускай літаратуры ў школах, тэхнікумах, вну. Прыходзяць яны ў бібліятэкі, як правіла, з канкрэтнымі запатрабаваннямі. Асаблівасцю іх інтарэсаў з'яўляецца тое, што яны чытаюць як для сябе, так і для сваіх вучняў, ці студэнтаў.

Чытачамі масавых бібліятэк з'яўляюцца пераважна настаўнікі агульнаадукацыйных школ, якім патрэбны разнастайны матэрыял як для правядзення ўрокаў, так і для пазакласнай і пазашкольнай работы. У рабоце з імі найбольш эфектыўнымі будуць інфармацыйныя формы прапаганды.

Галоўная крыніца інфармацыі для іх — штомесячны бібліяграфічны бюлетэнь «Новыя кнігі БССР», у якім, акрамя звестак пра новыя выданні, змяшчаюцца рэкамендацыйныя тэматычныя спісы літаратуры, матэрыялы да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў. Трэба рэкамендаваць выкладчыкам таксама бібліяграфічны паказальнік «Літаратура і мастацтва БССР», які з 1972 г. штогод выходзіць у рэспубліцы.

Звесткі пра новыя паступленні беларускай літаратуры і літаратуразнаўства ў бібліятэку неабходна ўключаць у інфармацыйныя спісы, якія высылаюцца ў сярэднія школы. Выкладчыкам літаратуры адрасуюцца дні інфармацыі, бібліятэкі бяруць іх на індывідуальнае інфармаванне. Чытачоў гэтай групы важна саміх прыцягваць да работы па прапагандзе беларускай літаратуры. Кантакты з імі дапамогуць у першую чаргу пры абслугоўванні вучняў.

Самі бібліятэкары павінны добра ведаць школьныя праграмы і спісы для пазакласнага чытання, загадзя рыхтавацца да пачатку вывучэння ў школе творчасці таго ці іншага пісьменніка. Настаўнікі дапамогуць бібліятэкарам падабраць найбольш цікавыя і даступныя для вучняў кнігі па літаратуразнаўству. Не менш як за месяц да вывучэння ў школе твор-

часці пісьменніка бібліятэка рыхтуе кніжныя выстаўкі, бібліяграфічныя агляды, гутаркі.

Работу па прапагандзе беларускай літаратуры сярод школьнікаў рэкамендуецца ўзгадняць з праграмай беларускага тэлебачання. Многія перадачы праграмы «Тэлебачанне — школе», якая перадаецца ў аўторак, сераду і пятніцу ў 9.00, прысвячаюцца беларускай літаратуры. Па тэме перадачы можна аформіць тэматычную паліцу і назваць яе так, як яна названа ў праграме тэлебачання. Можна проста рабіць тэматычныя падборкі да перадачы і трымаць іх побач з кафедрай выдачы.

Работа з вучнямі ў бібліятэках не павінна зводзіцца толькі да прапаганды літаратуры ў дапамогу школьнай праграме. Пры планаванні работы сумесна са школай вызначаюцца літаратурныя вечары, канферэнцыі чытачоў, дыспуты па асобных тэмах ці творах, якія ў школе не вывучаюцца. Бібліятэкарам карысна пазнаёміцца з артыкулам В. Я. Ляшук «Пазакласная работа па беларускай літаратуры», змешчаным у кнізе «Вывучэнне літаратуры» (Мн., 1980, с. 221—238). Работа па прапагандзе беларускай літаратуры павінна праводзіцца ў цеснай каардынацыі са школьнымі бібліятэкамі.

Самай разнастайнай і складанай як па ўзросту, так і па сацыяльнаму складу будзе ў бібліятэках група аматараў беларускай літаратуры. У рабоце з імі важнае месца зойме бібліяграфія. Вышэй ужо гаварылася пра бібліяграфічны бюлетэнь «Новыя кнігі БССР» і рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік «Літаратура і мастацтва Беларусі». Прадставіць інтарэс для аматараў новае выданне паказальніка «Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты», у які ўключаны творы мастацкай літаратуры, журналістыкі і публіцыстыкі, адзначаныя высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Паказальнік знаходзіцца ў друку.

Сярод чытачоў гэтай групы будуць такія, якія любяць чытаць творы аднаго ці некалькіх аўтараў, той ці іншы жанр, на тую ці іншую тэму і г. д. У рабоце з імі перавага будзе аддавацца выбарачнай індывідуальнай інфармацыі ў сувязі з іх інтарэсамі. У бібліятэках ім могуць быць адрасаваны кніжныя выстаўкі і тэматычныя паліцы па такіх тэмах, напрыклад, як «Сучасны беларускі раман», «Вобраз сучасніка ў беларускай літаратуры», «Вялікая Айчынная вайна ў беларускай літаратуры» і г. д. у залежнасці ад інтарэсаў чытачоў.

У групе аматараў беларускай літаратуры важна выявіць таксама людзей, здольных аказваць дапамогу бібліятэцы ў

арганізацыі клубаў па інтарэсах, у правядзенні масавых мерапрыемстваў па прапагандзе беларускай літаратуры.

Чытачоў, у фармулярах якіх 1—2 кнігі беларускіх аўтараў, нельга аднесці да аматараў беларускай літаратуры, але іх таксама трэба мець на ўвазе, ведаць іх інтарэсы і запатрабаванні.

У бібліятэках рэспублікі нямала чытачоў другіх нацыянальнасцей, якія цікавяцца беларускай літаратурай, але не ведаюць беларускую мову. Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У. І. Леніна сумесна з Дзяржаўнай бібліятэкай СССР імя У. І. Леніна рыхтуецца новае выданне бібліяграфічнага паказальніка «Белорусская литература», у які ўключаны творы беларускіх пісьменнікаў, выдадзеныя на рускай мове. Выйдзе паказальнік у 1988 годзе ў выдавецтве «Книга» і можа быць выкарыстаны ў рабоце з гэтай групай чытачоў.

### Індывідуальная работа

Работа бібліятэк не можа зводзіцца толькі да задавальнення інтарэсаў чытачоў, яна павінна быць накіравана на іх пашырэнне і паглыбленне. Гэта складаная задача рашаецца ўсёй сукупнасцю бібліятэчных сродкаў і метадаў.

Асобнае месца сярод іх займае індывідуальная работа. Выявіўшы цікавасць чытача да той ці іншай тэмы, аўтара, твора беларускай літаратуры, бібліятэкар падбірае некалькі кніг, блізкіх па тэматыцы да інтарэсу чытача. Пры гэтым улічваецца яго ўзрост і ўзровень адукацыі, чым выкліканы інтарэс, чым падабаецца аўтар, кніга, тэма. Гэта дасць магчымасць пераключыць увагу чытача ад твора да творчасці аўтара ў цэлым або да другіх кніг гэтай жа тэматыкі і г. д.

З мэтай прыцягнення ўвагі да чытання твораў беларускіх пісьменнікаў можна выкарыстаць і другія інтарэсы, не звязаныя з беларускай літаратурай. Так чытачам, якія цікавяцца гісторыяй, ці гістарычнай тэмай у мастацкай літаратуры, могуць быць рэкамендаваны, напрыклад, поруч з творамі класікаў беларускай літаратуры — К. Чорнага «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне», З. Бядулі «Салавей», кнігі сучасных аўтараў — І. Шамякіна «Петраград — Брэст», Я. Брыля «Золак, убачаны здалёк», У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі», Э. Скобелева «Мирослав, князь Дреговичский», Г. Далідовіча «Гаспадар-камень», Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі», В. Адам-

чыка «І скажа той, хто народзіцца», А. Мальдзіса «Восень пасярод вясны» і інш.

Тым, хто цікавіцца мінулым нашага краю, будуць цікавымі не толькі мастацкія творы, але і даследаванні А. Мальдзіса «Таямніцы старажытных сховішчаў», «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя», «На скрыжаванні славянскіх традыцый», прысвечаныя гісторыі беларускай літаратуры.

Аматараў літаратуры пра вайну можна зацікавіць кнігамі такіх вядомых пісьменнікаў як В. Быкаў, І. Навуменка, А. Адамовіч, І. Шамякін, Б. Сачанка, М. Стральцоў, І. Чыгрынаў, В. Казько.

Пры ўсёй неаднолькавасці ўзроставых асаблівасцей і патрабаванняў чытачоў нязменнай для ўсіх узростаў застаецца цікавасць да героя-равесніка, да героя-калегі па прафесіі. У адпаведнасці з гэтым маладым чытачам можна рэкамендаваць наступныя творы: «Падарожжа ў юнацтва» І. Навуменкі, «Пачакай, затрымайся» А. Васілевіч, «Сотая маладосць» У. Карпава, «Расце мята пад акном» А. Кулакоўскага, «Спатканне пасля разлукі» Р. Сабаленкі, «Самы высокі паверх» А. Савіцкага, «Чазенія» У. Караткевіча, «Кватарантка» Р. Баравіковай і інш.

Тым, хто абраў прафесію настаўніка, або хоча ім стаць, будзе цікава пазнаёміцца з героямі твораў С. Грахоўскага «Ранні снег», І. Шамякіна «Экзамен на восень», У. Скарынкіна «Апошні званок», А. Жука «Такая восень», Г. Далідовіча «Жаночае сэрца», М. Клебановіча «Ранішняе сонца».

Многіх чытачоў, асабліва маладых, цікавіць тэма дружбы і кахання. Іх інтарэсы могуць задаволіць кнігі І. Шамякіна «Непаўторная вясна», А. Савіцкага «Толькі аднойчы», «І нічога ўзамен», У. Караткевіча «Нельга забыць», В. Адамчыка «Млечны шлях», «Ліпавы цвет», А. Жука «Не забывай мяне», В. Быкава «Альпійская балада».

Часта прыцягвае ўвагу да кнігі яе экранізацыя. Гэта таксама можа выкарыстаць бібліятэкар, каб замацаваць і пашырыць інтарэсы чытачоў, пераключыць іх ад фільма да кнігі, ад кнігі да творчасці аўтара, ці да кніг такой жа тэматыкі другіх аўтараў.

Самым складаным у гэтай рабоце з'яўляецца ўлік індывідуальных асаблівасцей чытання, узроўню эстэтычнай падрыхтоўкі і ўспрыняцця прачытанага. Выявіць гэта дапамогуць гутаркі аб прачытаным, назіранні. Бібліятэкару важна ведаць, аднабакова ці поўна ўспрымае прачытанае чытач, што яго

больш за ўсё займае ў кнізе — востры сюжэт, лёс герояў, іх унутраны свет, маральныя ці сацыяльныя праблемы. Гэта падкажа, як правільна пабудаваць рэкамендацыйную гутарку, якой кнігай зацікавіць, параіць, на што звярнуць увагу пры яе чытанні. Пры звароце кнігі выяўляюцца адносіны чытача да таго ці іншага героя і яго ўчынкаў, да маральна-этычных або сацыяльных праблем, паднятых у творы, і г. д.

З другога боку, такія гутаркі будуць стымуляваць чытачоў да больш удумлівага чытання і больш глыбокага асэнсавання прачытанага, дапамагаць авалодваць культурай чытання.

У бібліятэкара, вядома, не будзе магчымасці ўдзяліць аднолькавую ўвагу ўсім чытачам. Такую работу пажадана праводзіць з моладдзю і, у першую чаргу, з малападрыхтаванымі чытачамі, якія больш за ўсё маюць патрэбу ў дапамозе бібліятэкара.

**Масавая прапаганда**

Індывідуальная работа дапаўняецца шырокай і шматгараннай масавай прапагандай, накіраванай як на шырокія колы чытачоў, так і на асобныя групы. Каб дала яна адчувальныя вынікі, бібліятэка павінна дакладна вызначыць: па-першае, якія яе напрамкі будуць лепш за ўсё садзейнічаць раскрыццю гістарычнага шляху беларускай літаратуры, яе багацця і своеасаблівасцей, па-другое, з дапамогай якіх форм і метадаў гэтага можна дасягнуць.

**Адным з важнейшых напрамкаў, у якім бібліятэкі, як ужо адзначалася вышэй, праяўляюць найбольшую актыўнасць, з'яўляецца прапаганда творчасці асобных пісьменнікаў і літаратуры аб іх.** Гэтая работа часцей за ўсё праводзіцца ў сувязі з юбілеямі. Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У. І. Леніна неаднаразова распрацоўваліся метадычныя рэкамендацыі да юбілеяў найбольш вядомых беларускіх пісьменнікаў: Я. Купалы, Я. Коласа, І. Шамякіна, і Мележа і інш., якія выходзілі як асобнымі выданнямі, так і друкаваліся ў бюлетэні «Новыя кнігі БССР». Выданы бібліяграфічныя паказальнікі «Максім Багдановіч» (Мн., 1977), «Якуб Колас» (Мн., 1983), «Янка Купала» (Мн., 1984). У бюлетэні «Новыя кнігі БССР» апублікаваны бібліяграфічныя спісы, прысвечаныя А. Куляшову (1983, № 3), В. Быкаву (1984, № 3), І. Навуменку (1985, № 1), К. Крапіве (1986, № 2) і многім іншым пісьменнікам.

Склалася пэўная сістэма работы па азнаменаванню юбілеяў пісьменнікаў. Выкарыстоўваецца, як правіла, сукупнасць розных мерапрыемстваў. Сярод іх — літаратурныя вечары, кніжныя выстаўкі, бібліяграфічныя агляды, канферэнцыі чытачоў па творчасці ў цэлым, або па асобных творах.

Паколькі гэты напрамак у рабоце добра забяспечаны метадычнымі матэрыяламі, ды і бібліятэкі маюць пэўны вопыт, мы не прыводзім рэкамендацый па прапагандзе творчасці канкрэтных пісьменнікаў. Трэба адзначыць, што кожны год багаты на юбілеі. Пералік памятных дат на кожны наступны год друкуецца ў адным з апошніх нумароў бюлетэня «Новыя кнігі БССР» за бягучы год.

У час юбілеяў, як правіла, павялічваецца колькасць запатрабаванняў чытачоў на творы пісьменніка і кнігі аб ім. Таму бібліятэкары павінны ўважліва праглядаць і распісваць матэрыялы з літаратуразнаўчых зборнікаў агульнага характару, своечасова адлюстроўваць у даведачна-бібліяграфічным апараце артыкулы з перыядычных выданняў.

Работа бібліятэк па азнаменаванню дня нараджэння таго ці іншага пісьменніка ўзгадняецца з іншымі ідэалагічнымі арганізацыямі, школамі, сярэднімі спецыяльнымі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, кінатэатрамі, шырока рэкламуецца на старонках мясцовых газет.

Пры планаванні комплексу мерапрыемстваў улічваюцца інтарэсы розных груп, прадугледжваюцца розныя формы прапаганды, садзейнічаючыя ўсебаковаму раскрыццю творчасці пісьменніка.

Але тут таксама трэба адзначыць, што магчымасці бібліятэкі ў многім залежаць ад наяўнасці ў яе фондах твораў аўтара і кніг пра яго творчасць.

Работа па прапагандзе творчасці беларускіх пісьменнікаў не павінна зводзіцца толькі да азнаменавання юбілеяў. З дапамогай цікавых масавых мерапрыемстваў увагу чытачоў варта звярнуць на менш вядомых сучаснаму чытачу аўтараў, на творы, якія ў школе не вывучаюцца. Асабліва гэта датычыцца пісьменнікаў дарэвалюцыйных часоў і першых гадоў Савецкай улады. Сярод іх Ян Чачот, Янка Лучына, Янка Журба, Алесь Дудар, Максім Гарэцкі і інш. Матэрыялы пра іх змешчаны перш за ўсё ў літаратурных зборніках агульнага характару, некаторым прысвечаны асобныя выданні. Творчасці празаікаў аб'яднання «Маладняк» прысвечана кніга «Шляхамі арлянят» У. Навумовіча (Мн., 1984). Рэкамендуем прысвяціць ім цыкл мерапрыемстваў пад агульнай назвай «Літара-

турныя партрэты» з прыкладна такой тэматыкай: «Ян Чачот — беларускі і польскі паэт», «Пісьменнікі-дэмакраты» (В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гуры-новіч), «Цішка Гартны — пісьменнік і грамадскі дзеяч», «Браму скарбаў сваіх адчыняю» (М. Гарэцкі), «Акрыленыя рэвалюцыяй» (паэты-маладнякоўцы).

**Гэты цыкл як бы падводзіць нас да другога напрамку прапаганды літаратуры — гістарычна-храналагічнага.** Тут маецца на ўвазе раскрыццё гістарычнага шляху беларускай літаратуры ў храналагічнай паслядоўнасці, работа з кнігамі пэўнага перыяду, прапаганда творчасці пісьменнікаў, аб'яднаных агульным жыццёвым лёсам.

Чытачам пэўна будзе цікава бліжэй пазнаёміцца з жыватворнай крыніцай беларускай літаратуры — вуснай народнай творчасцю, зрабіць падарожжа ў літаратурнае мінулае, даведацца пра таямніцы старажытных сховішчаў Беларусі.

Эфектыўнай формай знаёмства з вуснай народнай творчасцю стануць вечары народнага фальклору, народнай песні, беларускай казкі, народнага жарту і гумару «Беларусы смяюцца і жартуюць», «Трапным словам», прыказак і прымавак «Мудрыя парады» і інш. Пры гэтым важна паказаць уплыў народнай творчасці на развіццё беларускай літаратуры, на творчасць асобных пісьменнікаў і паэтаў. Мерапрыемствы стануць цікавейшымі, калі ў іх правядзенні прымуць удзел фальклорныя калектывы, якіх цяпер шмат у рэспубліцы. Найбольш поўнае ўяўленне пра жанры фальклорных твораў даюць кнігі «Народная спадчына» (Мн., 1984), «Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі» (Мн., 1984).

Спецыяльныя мерапрыемствы можна прысвяціць такому складанаму перыяду гісторыі беларускай літаратуры другой паловы XVII—XVIII стст., у які адбываўся пераход ад старажытнай да новай літаратуры. Нягледзячы на тое, што за гэты даволі працяглы адрэзак часу Беларусь не дала свету літаральна ніводнага вядомага пісьменніка ці паэта, літаратурнае жыццё ў ёй не затухала. У тагачаснай ананімнай, пазбаўленай права друкавацца беларускай літаратуры развіваліся розныя ідэйна-мастацкія напрамкі і стылі, ішла барацьба думак і густаў.

Бліжэй пазнаёміцца з гэтым перыядам дазволіць літаратурны вечар ці вусны часопіс пад назвай «Падарожжа ў літаратурнае мінулае». Падрыхтавацца да яго дапамогуць кнігі беларускага літаратуразнаўца і крытыка А. Мальдзіса «На скрыжаванні славянскіх традыцый» (Мн., 1980), «Таямніцы

старажытных сховішчаў» (Мн., 1974), «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя» (Мн., 1982), напісаны ім раздзел «Литература второй половины XVII—XVIII вв.» у кнізе «История белорусской дооктябрьской литературы» (Мн., 1977).

Пры раскрыцці тэмы важна расказаць і пра неспрыяльныя гістарычныя ўмовы, у якіх тады аказалася Беларусь, знаходзячыся ў складзе Рэчы Паспалітай, і пра развіццё беларускага мастацтва ў тыя часы, і пра ўплыў польскай, рускай і ўкраінскай літаратур на беларускую.

Асаблівае значэнне ў гісторыі беларускай літаратуры мае перыяд з канца XVIII ст. да 1917 г., які звычайна называецца новым перыядам. Ад асобных, часта жартоўных твораў, сярод якіх самыя значныя «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», да такіх выдатных майстроў слова, як Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч, З. Бядуля, М. Гарэцкі, Ц. Гартны,— такі шлях прайшло беларускае мастацкае слова за гэтыя амаль паўтара стагоддзі. Стваральнікамі навейшай беларускай літаратуры былі таксама Я. Лучына, А. Гурыновіч, Ядвігін Ш., А. Гурло, Я. Журба, К. Буйло і інш.

«Беларуская літаратура: шлях да рэалізму» — пад такой назвай могуць быць праведзены мерапрыемствы, прысвечаныя гэтаму перыяду яе развіцця. Мэтазгодна арганізаваць кніжныя выстаўкі, вусныя часопісы, літаратурныя вечары, у аснову якіх палажыць прынятую ў гісторыі новай беларускай літаратуры перыядызацыю.

Новую эру ў развіцці беларускай літаратуры адкрыла Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя. Яна дала неабмежаваныя магчымасці для творчасці выдатным прадстаўнікам дэмакратычнай дакастрычніцкай літаратуры. Выйшла на літаратурную арэну і новае пакаленне таленавітых пісьменнікаў: М. Чарот, М. Лынькоў, К. Крапіва, М. Зарэцкі, У. Дубоўка, А. Александровіч, К. Чорны, Х. Шынклер, П. Галавач, Я. Пушча, П. Трус, А. Якімовіч. Па меры ўступлення ў літаратуру да іх далучыліся А. Куляшоў, П. Пестрак, П. Броўка, П. Глебка, Р. Сабаленка, Э. Самуйлёнак, М. Лобан, П. Панчанка і інш.

Раскрыццю савецкага перыяду ў гісторыі беларускай літаратуры будуць садзейнічаць мерапрыемствы такой тэматыкі: «Вялікі Кастрычнік і станаўленне беларускай савецкай літаратуры», «Беларуская савецкая літаратура: летапіс эпохі», «На шляху служэння народу».

У літаратуры савецкага перыяду асобна выдзяляюцца чатыры ваенныя гады. Творы, напісаныя ў разгар вайны, абуджалі высокія патрыятычныя пачуцці людзей, падтрымлівалі веру ў непазбежную перамогу. З гадамі яны не страцілі свайго ідэйна-эстэтычнага значэння. Творы ваеннай пары прадстаўлены ў першым раздзеле рэкамендацыйнага паказальніка «Вялікая Айчынная вайна ў творчасці беларускіх пісьменнікаў» (Мн., 1985).

У рабоце з літаратурай гэтага перыяду можна выкарыстаць метадычныя парады «Великий подвиг советского народа» (Мн., 1984), падрыхтаваныя Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У. І. Леніна да 40-годдзя перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць паэзіі, якая ў гады Айчыннай вайны дасягнула найбольшых поспехаў. Вечары паэзіі, вусныя часопісы, кніжныя выстаўкі, бібліяграфічныя агляды і г. д., прысвечаныя як паэтычнаму майстэрству асобных стваральнікаў ваеннай паэзіі (Я. Купалу, Я. Коласу, П. Броўку, П. Глебку, А. Куляшову, М. Танку, П. Панчанку, А. Астрэйку, А. Зарыцкаму, М. Лужаніну, П. Прыходзьку, М. Сурначову і інш.), так і яе важнейшым тэмам («Беларусь, я — твой воін адданы і сын», «Партызаны, партызаны, беларускія сыны», «Недапетыя песні», «Паэзія подзвігу і подзвіг паэзіі» і інш.), дапамогуць пазнаёміць чытачоў з паэтычным летапісам тых векапомных дзён.

Лепшыя традыцыі, галоўныя заканамернасці і тэндэнцыі, ідэйна-эстэтычныя якасці савецкай літаратуры асабліва яскрава выявіліся на сучасным этапе. Творчасць П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава, Я. Брыля, І. Навуменкі, А. Макаёнка і іншых пісьменнікаў сведчыць аб тым, што беларуская літаратура стала адным з самых актыўных, перадавых атрадаў шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Нямала значных твораў з'явілася за апошні час ва ўсіх жанрах беларускай літаратуры. Больш падрабязна яны разглядаюцца далей. Зробленае і дасягнутае нашай пісьменніцкай арганізацыяй за апошнія пяць гадоў аналізавалася на IX з'ездзе пісьменнікаў БССР, матэрыялы якога павінны добра ведаць усе бібліятэкары*. Пры асвятленні сучаснага этапа развіцця беларускай літаратуры можна выкарыстаць парады, што даюцца ў іншых напрамках прапаганды, якія намі прыводзяцца ніжэй.

---

* Літ. і мастацтва. 1986. 25 крас. С. 1—9.

У гістарычна-храналагічным напрамку можна вызначыць і некалькі іншы аспект — выкарыстанне беларускай мастацкай літаратуры ў раскрыцці, вывучэнні гісторыі самой Беларусі, а таксама ў краязнаўстве. Гэтая работа адрасуецца як выкладчыкам гісторыі і вучням, так і масаваму чытачу.

Пэўна многіх зацікавіць тэма «Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах». Ёй можа быць прысвечаны цыкл масавых мерапрыемстваў, раскрываючых у храналагічнай паслядоўнасці гісторыю рэспублікі праз фальклорныя і літаратурныя творы. З'арыентавацца ў іх дапаможа кніга, адрасаваная вучням сярэдняй школы і настаўнікам гісторыі, якая так і называецца «Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах» (Мн., 1979). Па гэтай кнізе могуць быць падабраны творы, якія датычацца пэўнай мясцовасці, прадстаўляюць цікавасць ў краязнаўстве.

Дапоўніць матэрыялы кнігі раздзел «Творы на гістарычную тэму» з тэматычнага паказальніка, што маецца ў кожным выпуску штогодніка «Літаратура і мастацтва БССР». Трэба мець на ўвазе, што творы мастацкай літаратуры ўключаны ў рэкамендацыйныя паказальнікі «Гісторыя Камуністычнай партыі Беларусі» (Мн., 1981) і «Гісторыя камсамола Беларусі» (Мн., 1984), якія таксама могуць быць выкарыстаны пры раскрыцці гістарычнай тэмы. Пытанні літаратурнага краязнаўства будуць разглядацца далей.

**Вялікі прастор для работы адкрывае праблемна-тэматычны напрамак прапаганды літаратуры.**

Сярод шматлікіх тэм і вобразаў беларускай літаратуры асобнае месца займае літаратурная Ленініяна. Светлы вобраз правадыра знайшоў шырокае адлюстраванне як ў фальклоры, так і ў мастацкай літаратуры. Яму прысвечаны казкі, легенды, песні, прыказкі і прымаўкі, вершы, паэмы, раманы, аповесці, апавяданні. З магчымай паўнатой яны адлюстраваны ў бібліяграфічным паказальніку «Беларуская літаратурная Ленініяна» (Мн., 1976), які можа быць выкарыстаны ў падрыхтоўцы вечароў, лекцый, гутарак. Асаблівай увагі заслугоўвае гістарычны раман І. Шамякіна «Петраград — Брэст», прысвечаны Уладзіміру Ільічу.

Пры правядзенні мерапрыемстваў мэтазгодна выкарыстаць і другія выпускі серыі бібліяграфічных паказальнікаў «Беларуская Ленініяна», прысвечаныя ленінскай тэме ў тэатры, музыцы, выяўленчым мастацтве.

Другой тэмай, займаючай вядучае месца ў літаратуры беларускага народа, з'яўляецца тэма Вялікай Айчыннай вайны.

Пераканаўчым прызнаннем дасягненняў літаратуры на гэтую тэму з'явілася прысуджэнне Ленінскай прэміі 1986 г. В. Быкаву за аповесць «Знак бяды». Больш значныя па зместу і ідэйнай накіраванасці творы пра вайну змешчаны ў рэкамендацыйным паказальніку «Вялікая Айчынная вайна ў творчасці беларускіх пісьменнікаў» (Мн., 1985). Удачныя назвы раздзелаў паказальніка «Прыйшла ў край няпрошана вайна», «Вайны рубцы не зараслі яшчэ...», «Толькі нічога забыць не змагла ты, памяць мая» паслужаць тэмай кніжных выставак, літаратурных вечароў, вечароў паэзіі і інш.

Шырока практыкуюцца ў бібліятэках канферэнцыі чытачоў і абмеркаванні кніг пра вайну асобных аўтараў. Дзяржаўная бібліятэка неаднаразова змяшчала ў сваіх выданнях метадычныя рэкамендацыі па правядзенню канферэнцый і абмеркаванняў кніг такіх вядомых аўтараў, як В. Быкаў, А. Адамовіч, І. Шамякін, І. Навуменка. Вакол іх і канцэнтруецца ў асноўным работа ў бібліятэках, бо іменна яны ўнеслі вялікі ўклад у распрацоўку тэмы вайны, самі былі яе ўдзельнікамі, вынеслі на сваіх плячах цяжар ваеннага ліхалецця.

Тэма вайны плённа працягваецца і ў творчасці пісьменнікаў маладога пакалення, якія ведаюць пра яе па ўспамінах дзяцінства, ды праз памяць чужую,— сваіх землякоў, родных, блізкіх, якія па-новаму асэнсоўваюць падзеі тых грозных часоў. Гэта І. Чыгрынаў, М. Стральцоў, В. Казько, Б. Сачанка. Іх творы таксама заслугоўваюць вялікай увагі, таму што змяшчаюць у сабе вялікі выхаваўчы патэнцыял.

Асобна трэба сказаць пра такія з'явы ў літаратуры апошніх гадоў пра вайну, як кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я — з вогненнай вёскі» і С. Алексіевіч «У вайны — не жаночы твар...» З іх старонак паўстае і веліч народнага подзвігу, і нескаронасць народнага духу, і невынішчальнасць веры ў чалавека і чалавечнасць. Матэрыялы кнігі могуць паслужыць тэмай канферэнцыі чытачоў «Абвінавачвае Беларусь», урокаў мужнасці, мітынгаў пратэсту, палітычных дыскусій.

У далёкай гісторыі знаходзяцца вытокі так званай вясковай тэмы ў беларускай літаратуры. Тэма зямлі, тэма бацькаўшчыны прайшла праз творчасць амаль што ўсіх беларускіх пісьменнікаў, пачынаючы ад яе родапачальнікаў Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа і да нашых сучаснікаў. Страчанай і знойдзенай бацькаўшчыне, без якой не можа быць сапраўднага шчасця, прысвечаны творы М. Зарэцкага, П. Галавача,

К. Чорнага, праблема зямлі з'яўляецца галоўнай у рамане А. Чарнышэвіча «Засценак Малінаўка» і інш.

Асобна стаіць у сучаснай беларускай прозе «Палеская хроніка» І. Мележа, якую А. Адамовіч назваў «завяшчальны сыноўні гімн роднай зямлі, палітай потам і крывавымі слязамі, сагрэтай і ачалавечанай рукамі, маладосцю, сэрцамі бясконцых пакаленняў працоўных людзей». І поруч з трылогіяй І. Мележа — невялікая па памеры аповесць Я. Брыля «Ніжнія Байдуны», якую другі крытык М. Мушынскі назваў народнай кнігай. Арганічна ўпісваюцца ў гэтую тэматыку раманы В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына» і А. Кудраўца «Сачыненне на вольную тэму». А. Кудравец наогул унёс значны ўклад у распрацоўку вясковай тэматыкі сваімі апавяданнямі і аповесцямі. Пра лёс сучаснай беларускай вёскі пішуць Я. Сіпакоў, Б. Сачанка, І. Пташнікаў і інш.

Творы сучаснай беларускай прозы, прысвечаныя жыццю савецкай вёскі, аналізуюцца ў кнігах Савік Л. С. «Адчуванне часу» (Мн., 1981) і «Каб не астыла цяпло зямлі» (Мн., 1984).

Гэтыя творы не могуць пакінуць раўнадушнымі нашых сучаснікаў, заклікаюць даражыць сваёй Айчынай, сваёй бацькаўшчынай, прывіваюць любоў да зямлі. Яны могуць паслужыць тэмай для дыспутаў, дыскусій. Іх абмеркаванне трэба звязваць з высвятленнем і асэнсаваннем тых задач, якія сёння ставіць перад намі жыццё.

Блізкай да папярэдняй з'яўляецца тэма прыроды ў мастацкай літаратуры. Яна таксама мае глыбокія гістарычныя карэнні. Новае гучанне набыла гэтая тэма ў сучаснай беларускай літаратуры, якая ваяўніча абараняе прыроду, заклікае людзей уважліва адносіцца да яе. Асабліва характэрны ў гэтым плане раман В. Казько «Неруш», у якім аўтар заклікае па-дзяржаўнаму адносіцца да прыроды, трымаць адказ перад сваім сумленнем, грамадскасцю. Гэтая тэма праходзіць праз лірычныя і публіцыстычныя вершы і паэмы П. Панчанкі, М. Танка, А. Куляшова, А. Вярцінскага, П. Макаля, Р. Барадуліна, В. Зуёнка, праз апавяданні, аповесці і раманы І. Пташнікава, В. Карамазава, С. Кухарава, А. Кудраўца, А. Жука. Творы беларускіх пісьменнікаў, прысвечаныя прыродзе, выдзелены ў асобны раздзел у рэкамендацыйным паказальніку «Прырода Беларусі» (Мн., 1981).

«Прырода Беларусі ў літаратуры, выяўленчым мастацтве, музыцы», «Зямля Беларусі! Табой мы сагрэты», «Мой родны кут, як ты мне мілы», «Люблю мой край» — так могуць назы-

ваццa літаратурныя вечары, вусныя часопісы, бібліяграфічныя агляды, кніжныя выстаўкі і іншыя мерапрыемствы.

Як і ўся шматнацыянальная савецкая літаратура, беларуская літаратура пільную ўвагу ўдзяляе пошуку станоўчага героя, даследаванню, асэнсаванню духоўнага свету чалавека, вырашэнню маральна-этычных праблем сучаснасці.

Свае лепшыя творы пісьменнікі прысвяцілі камуністам, бо ў іх паводзінах і ўчынках бачылі яны выяўленне ўсяго самага лепшага, самага высакароднага. Тэма «Быць чалавекам на зямлі» можа быць раскрыта іменна праз вобразы камуністаў у трылогіі І. Мележа, творах М. Лобана «На парозе будучыні» і «Гарадок Устронь», А. Чарнышэвіча «Засценак Малінаўка», В. Быкава «Сотнікаў» і «Воўчая зграя», І. Чыгрынава «Плач перапёлкі», І. Шамякіна «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», У. Карпава «Сотая маладосць», Л. Гаўрылкіна «Не магу без цябе».

Асабліва вялікую ўвагу беларуская літаратура ўдзяляла выяўленню сутнасці чалавека, яго духоўнага патэнцыялу, маральных магчымасцей ва ўмовах вайны, якія патрабавалі ад чалавека вялікага напружання фізічных і духоўных сіл, асабістага вырашэння пытанняў, ад якіх залежаў і яго лёс, і лёс іншых людзей, і лёс краіны. Тэму «Вайною выпрабоўваўся чалавек» дапамогуць раскрыць творы І. Шамякіна «Вазьму твой боль», «Гандлярка і паэт», В. Быкава «Сотнікаў», «Яго батальён», «Абеліск», А. Адамовіча «Хатынская аповесць», І. Пташнікава «Найдорф», В. Казько «Суд у Слабадзе» і інш.

Займаецца беларуская літаратура даследаваннем духоўнай сутнасці сучасніка ў сферы працоўнай штодзённасці і бытавых абставін. «Час. Літаратура. Герой», «Духоўны свет сучасніка», «Чалавек у свеце абставін» — так можна сфармуляваць гэтую тэму ў сучаснай літаратуры. Адлюстроўваецца яна ў творчасці Б. Сачанкі, Я. Сіпакова, А. Кудраўца, А. Жука, В. Гігевіча, Г. Далідовіча, В. Казько, А. Дударава, Л. Калодзежнага, А. Варановіча. Асобна можна назваць раман І. Пташнікава «Алімпіяда», аповесць А. Кудраўца «Раданіца» і раман «Сачыненне на вольную тэму». Усім ім характэрна ўвага да зямных клопатаў і перажыванняў, турбот простага чалавека, праз якія яны і паказваюць яго тонкую духоўную арганізацыю.

На гэтым не канчаецца пералік праблем і тэм, якія характэрны для беларускай літаратуры, іх яшчэ шмат, але гэтыя важнейшыя, найбольш значныя.

**Шырокія магчымасці перад бібліятэкамі адкрывае жанравы напрамак у прапагандзе літаратуры.**

Сярод жанраў беларускай літаратуры асобна можна вылучыць апавяданне. Ужо на раннім этапе развіцця літаратуры з'явіліся такія высокія ўзоры гэтага жанру, як «Сяргей Карага» Я. Коласа, «Генерал» М. Гарэцкага, «Бярозы на шляху» Ц. Гартнага, іх традыцыі працягваліся ў апавяданнях К. Чорнага, М. Лынькова, Я. Скрыгана, М. Ракітнага, І. Навуменкі, Я. Сіпакова, А. Кудраўца, Б. Сачанкі. Адным з самых прадуктыўных навелістаў нашых дзён з'яўляецца А. Жук. Пладатворна працуюць у гэтым жанры Л. Калодзежны, В. Іпатава, В. Гігевіч і інш. Выдадзена двухтомная анталогія беларускага апавядання. Бібліятэкі могуць арганізаваць вечары беларускага апавядання, у ходзе якіх пазнаёмяць чытачоў з гісторыяй станаўлення гэтага жанру, з творчасцю асобных пісьменнікаў, раскрыюць найбольш значныя і характэрныя для апавядання тэмы, раскажуць пра галоўных герояў, якімі часцей за ўсё былі простыя людзі, у асноўным вясковыя, часам нават дзівакаватыя, але высокай маральнай чысціні і актыўнасці.

Вядучае месца ў беларускай сучаснай прозе заняў раман, у якім шырока асэнсоўваецца гістарычны шлях беларускага народа і яго сённяшняе жыццё. «Сучасны беларускі раман», «Беларускі гістарычны раман», «Вобраз камуніста ў беларускім рамане», «Прырода ў беларускім рамане» — такія і іншыя тэмы будуць садзейнічаць прапагандзе гэтага жанру ў беларускай літаратуры.

Магчымы розны падыход да прапаганды беларускай паэзіі. Работа можа быць накіравана на раскрыццё яе тэм, ідэй, вобразаў, лірычных характараў. Самай разнастайнай тэматыкі будуць вечары паэзіі ў бібліятэках: «Пачынаемся з Леніна мы», «Табе нашы думы і песні», «Камуністы — гэта слова як са сталі», «Голас паэзіі — голас міру», «Ад скарбаў роднае зямлі», «Сэрцам табе прысягаю», «Недапетыя песні» (аб паэтах, загінуўшых на вайне), «Адрас паэзіі — адрас любві», «Галасы закаханых у беларускай паэзіі», «Ты мне вясною прыснілася», вечары-конкурсы «Мой любімы паэт», «Мой любімы верш».

Шмат матэрыялаў для прапаганды дае творчасць асобных паэтаў ад яе класікаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі да нашых сучаснікаў. У розныя гады сцвердзілі сябе як сапраўдныя таленты П. Трус, К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, М. Танк, М. Лужанін, С. Грахоўскі, А. Астрэйка, П. Панчанка, А. Пысін, Н. Гілевіч, А. Вялюгін, К. Кі-

рэенка, Р. Барадулін, А. Бялевіч, Я. Сіпакоў, Е. Лось, Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, П. Прыходзька, А. Аўрамчык і інш.

Таленавіта заявіла пра сябе і маладое пакаленне паэтаў: Я. Янішчыц, А. Разанаў, К. Камейша, Р. Семашкевіч, В. Іпатава, М. Дукса, М. Федзюковіч, У. Скарынкін, Н. Мацяш, Н. Тулупава, І. Арабейка, Г. Пашкоў, У. Някляеў, П. Марціновіч, В. Гардзей, В. Ярац, В. Коўтун, Л. Дайнека, Ю. Голуб, С. Законнікаў, Р. Баравікова, Г. Каржанеўская.

Творчая індывідуальнасць кожнага з гэтых паэтаў можа стаць тэмай вечара паэзіі, вуснага часопіса, кніжнай выстаўкі, бібліяграфічнага агляду.

Арганізуюцца ў бібліятэках святы, дні і часы паэзіі, клубы яе аматараў. Шырока павінен выкарыстоўвацца ў рабоце штогоднік «Дзень паэзіі», які выходзіць з 1965 года. У 1986 г. выдадзены юбілейны зборнік «Дзень паэзіі», у які ўключаны выбраныя творы за 1965—1984 гг.

Плённым здабыткам беларускай літаратуры з'яўляецца шматжанравая і тэматычна разнастайная драматургія. Лепшыя п'есы беларускіх пісьменнікаў вывелі яе не толькі на ўсесаюзную, але і на сусветную сцэну.

У рабоце з драматургіяй трэба ўлічваць яе спецыфіку і адрозненне ад іншых літаратурных жанраў, якія заключаюцца ў тым, што поўнакроўнае жыццё драматычны твор атрымоўвае на сцэне, у кіно, на тэлебачанні. Таму прапаганда п'ес беларускіх аўтараў павінна весціся ў цеснай сувязі з кнігамі пра іх сцэнічнае або экраннае жыццё. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць прапагандзе драматургіі сярод удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, калектываў народных тэатраў.

Бібліятэкі могуць арганізаваць кніжныя выстаўкі або тэматычныя паліцы «Беларуская драматургія ад вытокаў да сталасці», прысвяціць іх асобным жанрам (драме, камедыі), ці тэмам (героіка—рэвалюцыйнай барацьбы, Радзімы, працы) драматургіі. Прадстаўленыя на выстаўках у храналагічнай паслядоўнасці п'есы беларускіх драматургаў, пачынаючы ад В. Дуніна-Марцінкевіча і канчаючы нашымі сучаснікамі К. Крапівой, А. Макаёнкам, К. Губарэвічам, М. Матукоўскім, А. Петрашкевічам, А. Дударавым, А. Дзялендзікам, А. Махначом, Я. Шабаном, дапамогуць прасачыць станаўленне і шлях развіцця гэтага жанру.

Усё большую ўвагу да сябе прыцягвае беларуская публіцыстыка. Лепшыя нарысы выходзяць штогод у зборніку «Сучаснік», маецца спецыяльная серыя кніг нарысаў «Рэспубліка. Час. Людзі». Вялікі ўклад у гэты жанр унеслі Я. Брыль,

І. Дуброўскі, В. Палтаран, Я. Сіпакоў, А. Казловіч, С. Алексіевіч, У. Караткевіч і іншыя, якія ўзбагацілі плённыя традыцыі, закладзеныя Ц. Гартным, М. Зарэцкім, Я. Коласам, В. Сташэўскім, Я. Скрыганам, Э. Самуйлёнкам і іншымі пісьменнікамі старэйшага пакалення.

Можна вызначыць такія тэмы ў рабоце з публіцыстыкай: «Пяром публіцыста», «На пульсе жыцця», «Рэспубліка. Час. Людзі», «Чалавек і яго праца», «Рапарт сучаснікам».

Гаворачы пра жанры нельга не сказаць і пра літаратурную крытыку, якая дапамагае як чытачу, так і самому бібліятэкару асэнсоўваць змест літаратуры. Яе прапаганда павінна весціся ў цеснай сувязі з самімі творамі мастацкай літаратуры. Дапамогуць у гэтым працы такіх аўтараў, як М. Арочка, М. Барсток, Дз. Бугаёў, Р. Бярозкін, В. Бечык, В. Гніламёдаў, А. Лойка, М. Лазарук, В. Рагойша, манаграфічныя даследаванні А. Адамовіча, П. Дзюбайлы, В. Каваленкі. Новыя артыкулы і даследаванні беларускіх крытыкаў пра сучасную літаратуру друкуюцца ў зборніку «Вобраз». Пішуць літаратурна-крытычныя артыкулы і самі пісьменнікі. Ёсць у бібліятэках аўтабіяграфічныя кнігі і кнігі ўспамінаў. Некаторым пісьменнікам прысвечаны мастацкія творы.

Па-рознаму можа быць раскрыта літаратурна-крытычная, біяграфічная і мемуарная літаратура перад чытачамі: «Беларуская літаратура: гісторыя і сучаснасць», «Беларуская літаратура: дзень сённяшні», «Беларускія пісьменнікі пра час і пра сябе», «Пра таварышаў па пяру», «Пісьменнікі ўспамінаюць».

Асобна трэба сказаць пра работу з творамі, адзначанымі літаратурнымі прэміямі, а таксама з навінкамі беларускай літаратуры. З дапамогай паказальніка «Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты» мэтазгодна выдзеліць гэтыя творы ў кніжным фондзе на асобную паліцу, або аформіць пастаянна дзеючую кніжную выстаўку. Яны павінны пастаянна знаходзіцца ў полі зроку бібліятэкара, у першую чаргу шырока выкарыстоўвацца як у індывідуальнай, так і масавай рабоце. Не павінна прайсці паміма ўвагі кожнае новае прысуджэнне прэміі. Новым лаўрэатам прысвячаюцца самыя разнастайныя мерапрыемствы — вечары, канферэнцыі чытачоў, абмеркаванні, бібліяграфічныя агляды, кніжныя выстаўкі.

У рабоце з навінкамі трэба шырэй практыкаваць такія формы работы, як прэм'еры кніг, вечары «Першая кніга празаіка», «Першая кніга паэта», выстаўкі адной кнігі, больш увагі ўдзяліць публікацыям у рэспубліканскіх літаратурна-

мастацкіх часопісах. У серыях «Першая кніга празаіка» і «Першая кніга паэта» выйшлі зборнікі прозы «Сустрэча» (Мн., 1985) і паэзіі «Крыло» (Мн., 1984), якія можна абмеркаваць з чытачамі. Мэтазгодна арганізоўваць прагляды навінак беларускай літаратуры, выдадзенай за год.

**Краязнаўчы напрамак у прапагандзе разгледзім у плане работы з творамі пісьменнікаў, жыццё і творчасць якіх звязана з тым ці іншым краем.**

У Беларусі амаль што няма такіх куткоў, якія так ці інакш не былі б звязаны з імёнамі пісьменнікаў. Для Брэстчыны — гэта П. Багрым, У. Галубок, П. Пестрак, В. Таўлай, М. Засім; Віцебшчыны — П. Броўка, Э. Самуйлёнак, В. Быкаў, М. Зарэцкі, Я. Журба, М. Лынькоў, У. Дубоўка; Гомельшчыны — І. Мележ, І. Навуменка, І. Шамякін, М. Сурначоў, А. Макаёнак; Гродненшчыны — Я. Брыль, В. Адамчык, М. Арочка, А. Бажко, Д. Бічэль-Загнетава; Магілёўшчыны — П. Галавач, М. Гарэцкі, А. Куляшоў, А. Зарыцкі, Я. Казека; Міншчыны— З. Бядуля, Я. Колас, Я. Купала, М. Чарот, М. Лобан і інш. Сапраўднымі літаратурнымі гнёздамі на Міншчыне з'яўляецца Капыльшчына (Ц. Гартны, А. Бабарэка, А. Астрэйка, А. Адамовіч), Уздзеншчына (П. Глебка, К. Крапіва, П. Трус, Я. Скрыган) і іншыя раёны.

Лёс Я. Коласа быў цесна звязаны з беларускім Палессем, ён настаўнічаў на Піншчыне, многія палешукі сталі затым правобразамі яго літаратурных герояў. У бібліяграфічным паказальніку да 100-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа («Якуб Колас». Мн., 1983) маецца геаграфічны паказальнік, дзе названы мясцовасці, у якіх жыў або якія наведваў пісьменнік.

З дапамогай аўтабіяграфій беларускіх пісьменнікаў, змешчаных у кнігах «Пяцьдзесят чатыры дарогі» (Мн., 1963), «Пра час і пра сябе» (Мн., 1966), «Вытокі песні» (Мн., 1973), біяграфічнага даведніка «Пісьменнікі Савецкай Беларусі» (Мн., 1981), кніг успамінаў, манаграфій, прысвечаных пісьменнікам, бібліятэкі могуць раскрыць не толькі такія агульныя тэмы, як «Па літаратурных мясцінах рэспублікі», «Радзімай зямлі галасы», «Шляхамі паэтаў і герояў», але і больш вузкія, звязаныя толькі са сваім краем: «Пісьменнікі — нашы землякі», «Якуб Колас і Палессе», «Літаратурная Мядзельшчына», «Па сцежках Я. Брыля», «К. Чорны і Цімкавічы», «Па мясцінах, апісаных у «Палескай хроніцы» І. Мележа» і інш. Пры гэтым трэба шырока выкарыстоўваць грамадска-палітычную літаратуру, фотаальбомы, часопіс «Помнікі гі-

сторыі і культуры Беларусі». Асаблівую дапамогу акажуць кнігі С. Александровіча «Тут зямля такая» і К. Цвіркі «Твой курган векавечны» (Мн., 1985). Актыўна павінны выкарыстоўвацца паказальнікі літаратуры пра вобласці, якія выдаюцца абласнымі бібліятэкамі. Усе яны маюць раздзелы «Літаратурнае жыццё вобласці» і «Мясцовыя пісьменнікі». Мінская абласная бібліятэка выпускае серыю бібліяграфічных памятак чытачу «Пісьменнікі-землякі».

У гэтай рабоце асабліва важна ўстанавіць сувязі з мясцовымі і школьнымі краязнаўчымі музеямі, аддзяленнямі Таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры, школьнымі літаратурна-краязнаўчымі гурткамі.

Прапаганда беларускай літаратуры павінна весціся ў цеснай узаемасувязі з творамі мастацтва.

Перш за ўсё гэта датычыцца кінафільмаў або тэлефільмаў, знятых па мастацкіх творах. У розныя часы былі экранізаваны творы «На ростанях» Я. Коласа, «Атланты і карыятыды», «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч» І. Шамякіна, «Палеская хроніка» І. Мележа, «Война под крышами», «Сыновья уходят в бой» А. Адамовіча, «Раданіца» А. Кудраўца, многія аповесці В. Быкава і інш. Для розных груп моладзі (старшакласнікаў, навучэнцаў ПТВ, рабочых і інш.) разам з кінатэатрамі могуць быць арганізаваны кіналекторыі «Кнігі, прачытаныя экранам», «Літаратурныя героі на экране».

Асабліва карыснымі будуць канферэнцыі чытачоў па кнігах і фільмах, знятых па іх. Павінны адклікнуцца бібліятэкі на экранізацыю «Хатынскай аповесці» А. Адамовіча. Зняты па ёй фільм «Иди и смотри» нікога не пакінуў раўнадушным. Канферэнцыя па кнізе і фільму дапаможа па-новаму асэнсаваць паказаныя ў іх падзеі.

Многія мастацкія творы пакладзены на музыку, па іх напісаны оперы, песні, пастаўлены спектаклі. Раскрыць гэтыя ўзаемасувязі дапаможа прапаганда літаратуры па тэмах «Беларуская літаратура і тэатр», «Героі і музы», «Янка Купала і музыка», «Беларускія паэты-песеннікі» і інш.

Пры падборы матэрыялаў для выступленняў калектываў мастацкай самадзейнасці на масавых мерапрыемствах бібліятэкары могуць выкарыстаць рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс «У дапамогу мастацкай самадзейнасці» («Новыя кнігі БССР», 1983, № 3), у які ўключаны альманахі, анталогіі і зборнікі беларускай мастацкай літаратуры і фальклору.

Прапаганда беларускай літаратуры павінна весціся ў цесным адзінстве са шматнацыянальнай літаратурай народаў

СССР. Асабліва важна паказаць літаратурныя і культурныя ўзаемасувязі беларускага народа з рускім, украінскім, літоўскім, а таксама з польскім народамі, якія ідуць з дакастрычніцкіх часоў. Гісторыі гэтых адносін прысвечаны кнігі Г. Кісялёва «Героі і музы» (Мн., 1981), А. Мальдзіса «На скрыжаванні славянскіх традыцый» (Мн., 1980), М. Ларчанкі «Літаратурнае пабрацімства славян» (Мн., 1984) і інш.

Шыраты і шматграннасці прапаганды беларускай літаратуры можна дасягнуць шляхам спалучэння ўсіх разгледжаных аспектаў. Ажыццявіць дыферэнцыраваны падыход да чытачоў дапаможа ўключэнне мерапрыемстваў у праграмы лекторыяў, клубаў па інтарэсах, літаратурных гасціных, універсітэтаў культуры і інш. Для іх могуць быць распрацаваны спецыяльныя тэматычныя цыклы: «Народ — стваральнік мастацтва», «Літаратурныя партрэты», «Беларускае апавяданне ад вытокаў да сучаснасці», «Беларускі сучасны раман», «Паэзія і час», «Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах», «Літаратурныя героі на экране», «Паэзія маладых», «У сузор'і братэрскіх рэспублік», «На скрыжаванні славянскіх традыцый» і інш.

Цыклы могуць быць разлічаны на год і болей і ўключаць у сябе самыя разнастайныя мерапрыемствы: лекцыі, гутаркі, літаратурныя вечары, канферэнцыі чытачоў, дыспуты, літаратурныя віктарыны. Кожнае з іх павінна быць лагічным працягам папярэдняга.

У заключэнне трэба сказаць, што эфектыўнаць прапаганды беларускай літаратуры знаходзіцца ў прамой залежнасці ад таго, наколькі яе ведае і любіць бібліятэкар.

Пытанні прапаганды беларускай літаратуры павінны часцей выносіцца на семінары, часцей разглядацца ў метадычных выданнях. Карыснымі для бібліятэкараў будуць выступленні на семінарах выкладчыкаў беларускай літаратуры вну, літаратуразнаўцаў, сустрэчы з пісьменнікамі, членамі рэдакцый літаратурных часопісаў. У практыку медатадычнай работы павінна ўвайсці сістэматычнае правядзенне аглядаў навінак беларускай літаратуры за пэўны перыяд для бібліятэкараў.

Пастаянна павінны бібліятэкары сачыць за бюлетэнем «Новыя кнігі БССР», працаваць са штогоднікам «Літаратура і мастацтва Беларусі», з маючымся ў кожным яго выданні тэматычным паказальнікам, які дапаможа падабраць літаратуру па розных тэмах.

Пастаяннае пашырэнне і паглыбленне прапаганды беларускай літаратуры будзе садзейнічаць павышэнню яе ролі ў камуністычным выхаванні працоўных, больш поўнаму выкарыстанню яе эстэтычных і пазнавальных магчымасцей.

У дадатку змешчаны матэрыялы да правядзення масавых мерапрыемстваў, якія могуць быць выкарыстаны ў рабоце з моладдзю.

## НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

(Матэрыял да вечара беларускага народнага фальклору)

Вусная народная творчасць доўгі час з'яўлялася адным з важнейшых і любімых відаў мастацтва, у якім адлюстраваліся надзвычай багаты жыццёвы вопыт народа, яго шматгранны характар, востры розум, глыбокія пачуцці, імкненне вобразна асэнсаваць з'явы, што адбываліся ў прыродзе і грамадстве. Ад глыбокай старажытнасці фальклор неадступна і своеасабліва спадарожнічае гісторыі. Вялікі і актыўны ўплыў ён аказаў на літаратуру і прафесійнае мастацтва. Праходзіць час, а цікавасць да народнай творчасці не змяншаецца.

Мэта вечара — пазнаёміць чытачоў з надзвычай багатым і разнастайным у жанравых адносінах фальклорам беларускага народа, створаным ім за шматвяковую гераічную гісторыю.

### Праграма вечара

**I частка.** З жыватворных крыніц

У невялікім уступным слове ўдзельнікам вечара неабходна расказаць пра велізарную ідэйна-тэматычную разнастайнасць вуснай народнай творчасці, яе мастацкія вобразы. Пазнаёміць з асноўнымі жанрамі дапаможа літаратурная кампазіцыя, у якой невялікі расказ пра той ці іншы жанр будзе дапаўняцца выкананнем асобных твораў гэтага жанру. На адным вечары немагчыма ахапіць усе жанры, таму загадзя трэба ўстанавіць, пра якія з іх пойдзе гаворка. Гэта могуць быць паэтычныя творы, казкі і легенды, прыказкі і прымаўкі, загадкі. Вусная творчасць непасрэдна звязана з музыкай і танцамі. Таму літаратурную кампазіцыю дапоўніць выступленне этнаграфічнага калектыву, удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, якія выканаюць народныя танцы, песні і прыпеўкі. Калі такой магчымасці няма, то гэтыя творы могуць прагучаць у запісах.

**II частка.** З маленства і назаўжды...

Другую частку вечара можна пабудаваць як расказ-успамін удзельнікаў вечара пра мілагучную калыханку, якую ў дзяцінстве спявала ім маці ці бабуля, цікавую і дзівосную

казку бацькі ці дзядулі, народныя жарты, мудрыя і паэтычныя прыказкі свайго краю і г. д. Вядома, бібліятэка павінна загадзя выявіць людзей, якія змогуць выступіць з такімі ўспамінамі, пагутарыць з імі, праслухаць іх расказ.

**III частка.** Віктарына, складзеная з загадак беларускага народа.

Пытанні да віктарыны

Сядзіць паненачка ў чырвонай сукенсчцы, хто ідзе, дык паклоніцца.

(Суніца)

Хоць у капелюшы, а галавы не мае.

(Грыб)

Што ў вадзе сохне, а ў печы мокне?

(Воск)

Кругом вада, а з піццём бяда. Хто адгадае, дзе гэта бывае?

(На моры)

Чырвонае цельца, каменнае сэрца, вінная на смак, а завецца як?

(Вішня)

Што гарыць без полымя?

(Сонца)

Пад якім кустом заяц сядзіць, як дождж ідзе?

(Пад мокрым)

Дзве дачкі, дзве мацеры і бабулька з унучкай. Колькі ўсіх?

(Тры: бабка, маці, дачка)

Несла гаспадыня ў кошыку дзесяць яец, а дно ўпала. Колькі засталося?

(Нічога, усе разбіліся)

Дваццаць без пятнаццаці, трох не далажыўшы, двух не далічыўшы. Колькі будзе?

(Нічога)

Сядзіць Пахом на кані вярхом, сам непісьменны, а чытаць памагае.

(Акуляры)

У дзвюх матак па пяць хлапчанятак, кожнаму сыну адно імя.

(Пальцы)

У лес ідзе — дамоў глядзіць, дамоў ідзе — у лес глядзіць.
(Сякера)

Чым больш з яе бярэш, тым большай яна робіцца.
(Яма)

Поле нязмерана, быдла нязлічана, пастух рагаты.
(Неба, зоркі, месяц)

### Літаратура, песні, грамзапісы


**Народныя** казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі.— Мн.: Выд-ва БДУ, 1983.— 350 с.

**Народная** спадчына.— Мн.: Нар. асвета, 1984.— 208 с.

**Беларускі** казачны эпас.— Мн.: Выд-ва БДУ, 1976.— 207 с.

**Дрэва** кахання: Легенды, паданні, сказы.— Мн.: Маст. літ., 1980.— 160 с.

**Рапановіч Я. Н.** Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі.— Мн.: Выш. школа, 1984.— 384 с.

**Фядосік А. С.** Трапным народным словам.— Мн.: Навука і тэхніка, 1971.— 135 с.

**Анталогія** беларускай народнай песні.— Мн.: Беларусь, 1968.— 559 с.

**Беларускія** народныя песні: У 2-х т.— Мн.: Беларусь, 1971—1973.

Т. 1. 227 с.

Т. 2. 282 с.

**Народный** хор БССР /Худож. рук. М. Дриневский.— М.: Мелодия, 1983.— С 30-199009-10

**Белорусские** народные песни /Исполн. Этногр. анс. д. Ананчицы Солигор. р-на Мин. обл.— С 30-18065-65

**Белорусские** народные танцы /Исполн. Белорус. фольклор.-хореогр. анс. «Хорошки», вок. квартет «Купалинка», инструм. группа.—С 30-17191


## ЗЯМЛЯ БЕЛАРУСІ! ТАБОЙ МЫ САГРЭТЫ...

(Матэрыял да літаратурнага вечара)

Мэта вечара — пазнаёміць чытачоў з задушэўнымі старонкамі кніг беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, прысвечаных багатай і разнастайнай прыродзе Беларусі. Яе адвечная прыгажосць апета многімі аўтарамі, яркія пейзажныя замалёўкі і вершы з'яўляюцца неад'емнай, арганічнай, а часта і лепшай часткай іх творчасці. Многія творы аб прыродзе натхнілі кампазітараў на музыку.

Знаёмства з мастацкім апісаннем роднай прыроды, на нашу думку, не толькі дапаможа адчуць яе чароўнасць і прыгажосць, але, магчыма, заставіць задумацца над тым, як захаваць яе, што трэба зрабіць, каб кожная мясціна, дзе мы жывём, стала яшчэ прыгажэйшай.

## Праграма вечара

**І частка.** Слова аб роднай прыродзе

У першай частцы вечара павінна прагучаць кароткае ўступнае слова вядучага (бібліятэкара, настаўніка, ці запрошанага на вечар пісьменніка або літаратуразнаўца) пра творы беларускіх пісьменнікаў, прысвечаныя прыродзе Беларусі. Для яго падрыхтоўкі можна выкарыстаць раздзел «Прырода ў беларускай мастацкай літаратуры» рэкамендацыйнага паказальніка «Прырода Беларусі» (Мн., 1981), у якім, акрамя бібліяграфіі, маецца яшчэ невялікі агляд твораў аб прыродзе. Кнігі, выдадзеныя ў больш познія гады, дапаможа выявіць штогоднік «Літаратура і мастацтва Беларусі», у тэматычным паказальніку якога ёсць рубрыка «Прырода Беларусі».

**ІІ частка.** Люблю мой край

Другую частку вечара можна пабудаваць як літаратурна-музычную кампазіцыю з вершаў, урыўкаў з прозы, песень, напісанных на творы беларускіх пісьменнікаў аб прыродзе.

Матэрыялы да мастацкага чытання дапаможа падабраць зборнік «Слова аб роднай прыродзе» (Мн., 1968), у якім змешчаны лепшыя ўзоры пейзажных замалёвак з твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Неабходна выкарыстаць і другія творы, напісаныя пазней. Песні могуць прагучаць у запісе ці ў выкананні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Прапануем пачаць мастацкую частку ўрыўкам з верша М. Хведаровіча «Родныя вобразы» («Слова аб роднай прыродзе» с. 131—132 да слоў «Скажу я вам праўду адну...»). Затым можа прагучаць песня І. Лучанка «Мой родны кут» на словы Я. Коласа. У далейшым мастацкія творы выконваюцца ў такім парадку, як яны пададзены ў зборніку «Слова аб роднай прыродзе»: спачатку прысвечаныя вясне, затым лету, восені і зіме. Пра кожную пару года дастаткова падабраць па 2—3 урыўкі з прозы, па 2—3 вершы і па 1—2 песні.

Бібліятэкі могуць выкарыстаць і другі варыянт выканання мастацкіх твораў. Іх можна згрупаваць па апісанню асобных маляўнічых, а часта і запаведных мясцін (пра лес, азёры і рэкі, луг і поле і г. д.). Тады і другая частка вечара будзе на-

зывацца інакш — «Шмат казачных мясцін у Беларусі». У канцы трэба сказаць, творы якіх аўтараў выконваліся.

## Песні

**Буднік У.** Палессе: [Для хору ў суправадж. ф.-п.] /Сл. А. Грачанікава.— У нот.: Клубныя вечары.— Мн.: Беларусь, 1983, с. 3—7.

**Тое ж:** [Для голасу ў суправадж. ф.-п.].— Буднік У. Маладыя нашы вёсны.— Мн.: Беларусь, 1985, с. 34—37.

**Глебаў Я.** Хаджу сунічнымі барамі /Сл. У. Карызны.— У нот.: Ритмы молодых: (Сб. пьес белорус. композиторов, аранжир. для эстрад. анс.).— Мн.: Беларусь, 1983, с. 32—35.

**Глебаў Я.** Я ўдзячны лёсу: [Для голасу, хору ў суправадж. ф.-п.] /Сл. Г. Бураўкіна.— У нот.: Табе, Беларусь: Песні на вершы Г. Бураўкіна.— Мн.: Беларусь, 1984, с. 36—38.

**Зарыцкі Э.** Пакуль жыве мая бяроза: [Для хору ў суправадж. ф.-п.] /Сл. С. Законнікава.— У нот.: Клубныя вечары.— Мн.: Беларусь, 1985, с. 24—27.

**Захлеўны Л.** Зямля мая /Сл. У. Някляева.—Беларусь, 1984, № 7, с. 33.

**Захлеўны Л.** Азёры дабрыні: [Для хору ў суправадж. ф.-п] /Сл. У. Карызны.— У нот.: Клубныя вечары.— Мн.: Беларусь, 1985, с. 28—32.

**Лучанок І.** Жураўлі на Палессе ляцяць: [Для голасу з ф.-п.] /Сл. А. Ставера.— У нот.: Мой край беларускі: Песні на сл. А. Ставера.— Мн.: Беларусь, 1983, с. 57—62.

**Лучанок І.** Мой родны кут: [Для голасу ў суправадж. гітары] /Сл. Я. Коласа.— У нот.: Вместе с гитарой.— Мн.: Беларусь, 1985, с. 3—5.

**Лучанок І.** Світанак: [Для голасу ў суправадж. ф.-п.] /Сл. У. Някляева.— У нот.: Песенная панорама.— Мн.: Беларусь, 1984, с. 26—31.

**Семяняка Ю.** Явар і каліна /Сл. Я. Купалы //Беларусь. 1981. № 4. С. 31.

**Ханок Э.** Белы снег: [Для голасу, хору ў суправадж. ф.-п.] /Сл. Г. Бураўкіна.— У нот.: Табе Беларусь: Песні на вершы Г. Бураўкіна.— Мн.: Беларусь, 1984, с. 52—55.

**Ханок Э.** Вы шуміце, бярозы: [Для голасу ў суправадж. гітары] /Сл. Н. Гілевіча.— У нот.: Вместе с гитарой.— Мн.: Беларусь, 1985, с. 33—36.

## Грамзапісы

**Буднік У.** Пахне чабор /Сл. К. Кірэенкі; Выкон. «Чараўніцы», ВІА.— На грп.: «Чаровницы». С 62-18751-2

**Глебаў Я.** Я ўдзячны лёсу /Сл. Г. Бураўкіна; Выкон. «Сябры», ВІА.— На грп.: Письмо из 45-го. С 60-22595-6

**Тое ж.**— На грп.: «Сябры»: Судьбе спасибо. С 60-23041-2

**Лучанок І.** Бярозка /Сл. А. Вялюгіна; Выкон. Л. Барткевіч.— На грп.: Песни И. Лученка. С 60-10599-600

**Лучанок І.** Песня аб роднай зямлі /Сл. У. Карызны; Выкон. «Верасы», ВІА.— На грп.: Кругозор, 1979, № 1, эв. с. 7.

**Лучанок І.** Мой родны кут /Сл. Я. Коласа; Выкон. «Песняры», ВІА.— На грп.: Песняры зямлі беларускай. М 40-43831-2

**Тое ж.**— На грп.: Песни И. Лученка. С 60-105599-600

**Тое ж.**— На грп.: Лауреаты премии Ленинского комсомола. С 60-108887-8

**Тое ж.**— На грп.: Кругозор, 1978, № 4, зв. с. 10.

**Лучанок І.** Жураўлі на Палессе ляцяць /Сл. А. Ставера; Выкон. «Песняры», ВІА.— На грп.: «Песняры»: Зачарованая мая. С 60-19915008.

**Тое ж** /Выкон. «Сябры», ВІА.— На грп.: «Сябры»: Живая вода. С 60-1809300

**Лучанок І.** Світанак /Сл. У. Някляева; Выкон. Т. Рузавіна, С. Таюшаў.— На грп.: И Лученок. Песни и инструментальная музыка. С 62-20279 007

**Лучанок І.** Я не магу пра вас забыцца /Сл. П. Броўкі; Выкон.: Л. Барткевіч, эстрад. арк., дыр. М. Фінберг.— На грп.: И. Лученок. Песни и инструментальная музыка. С 62-20279007

**Тое ж.**— На грп.: Кругозор, 1982, № 9, зв. с. 8.

**Тое ж** /Выкон. «Чараўніцы», ВІА.— На грп.: «Чараўніцы». С 60-11063-4

**Сацура П.** Беларусь сінявокая /Сл. С. Панізніка; Выкон. «Сябры», ВІА.— На грп.: «Сябры»: Судьбе спасибо. С 60-23041005

## МНОГАМУ ІМ ТЫ Ў ЖЫЦЦІ АБАВЯЗАН

(Матэрыял да вечара паэзіі)

Наш вечар паэзіі мы прысвячаем памяці беларускіх паэтаў, якія гераічна загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вядома, немагчыма на адным вечары расказаць пра ўсіх паэтаў, таму мы выбралі толькі пецярых.

Для правядзення вечара патрэбна падабраць вядучага і некалькі выканаўцаў-чытальнікаў. Пажадана, каб адны выканаўцы расказвалі пра саміх паэтаў, другія чыталі іх вершы. Для зручнасці ў сцэнарыі мы іх называем першы, другі, трэці і г. д. На практыцы ўсё будзе залежыць ад таго, колькі выканаўцаў падбярэ бібліятэка.

Пры распрацоўцы літаратурнага сцэнарыя выкарыстаны выданне бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР «Радзіме — радок і жыццё» (Мн., 1986) і зборнікі «Крывёю сэрца» (Мн., 1967 і Мн., 1985).

Звяртаем асаблівую ўвагу бібліятэкараў на кнігу «Радзіме — радок і жыццё», дзе сабрана многа матэрыялаў пра

паэтаў, прыводзіцца бібліяграфія. З дапамогай гэтых выданняў бібліятэкары могуць распрацаваць сцэнарыі вечароў, прысвечаных землякам, ураджэнцам таго ці іншага краю і г. д.

### Літаратурны сцэнарый вечара

**Вядучы** — На мемарыяльнай дошцы ў будынку Саюза пісьменнікаў БССР увекавечаны імёны больш чым 20-ці паэтаў і празаікаў, аддаўшых сваё жыццё за Радзіму. Сярод іх Змітрок Астапенка, Леанід Гаўрылаў, Аркадзь Гейнэ, Алесь Жаўрук, Аляксей Коршак, Уладзімір Рагуцкі, Мікола Сурначоў, Мікола Сямашка і іншыя. Іх творы — гэта адна з самых дарагіх, святых і балючых старонак нашай паэзіі. Дачасна абарваліся іх маладыя жыцці. Леаніду Гаўрылаву і Аркадзю Гейнэ было па 23 гады, Аляксею Коршаку і Уладзіміру Рагуцкаму — па 24, Міколу Сямашку і Міколу Сурначову — па 27... Многа сапраўднага і важкага маглі б яны яшчэ стварыць. Ім, загінуўшым на вайне, мы многім абавязаны за воінскі подзвіг і за вершы — маладыя, шчырыя, свежыя, светлыя, у якіх працягваецца іх жыццё.

Сёння мы вам раскажам пра пецярых паэтаў, якія аддалі жыццё за Савецкую Радзіму ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Сурначоў, Коршак, Жаўрук, Астапенка, Дубровіч. Назаўсёды яны засталіся маладымі. Іх вершы, якія былі яшчэ толькі пачаткам, абяцаннем, сталі сапраўдным здабыткам нашай паэзіі і іх пасмяротнай спадчынай.

**Першы** — Мікола Сурначоў нарадзіўся ў 1917 г. у вёсцы Слабада Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1937—1939 гг. вучыўся на літаратурным факультэце Гомельскага пединстытута, у 1940—1941 гг. працаваў у рэспубліканскіх газетах «Звязда» і «Чырвоная змена», з пачатку вайны — у Чырвонай Арміі. Старшы лейтэнант Мікола Сурначоў некалькі разоў быў цяжка паранены, але ён дайшоў да Берліна і адтуль у Дзень Перамогі прыйшла трагічная вестка яго бацькам: «Ваш сын гвардыі лейтэнант Сурначоў Мікола Мікалаевіч... у баі за сацыялістычную Радзіму, верны воінскай прысязе, праявіўшы геройства і мужнасць, паў смерцю храбрых 20 красавіка 1945 года. Пахаваны ў пасёлку Фрэйдэнбер (Германія)». «Усе яго вершы ствараліся на полі бою — у траншэях над Дняпром, у бліндажах на Каўказе і Румыніі, на лясных прывалах у Беларусі і Польшчы, у шпіталях глыбокага тылу» (А Вялюгін). Не ўсё, напісанае паэтам у час вайны, захавалася. Як успамінае яго зямляк і

перакладчык Д. Кавалёў: «Нязменная падарожніца Міколы Сурначова — палявая кірзавая сумка, набітая не толькі тапаграфічнымі картамі, але і вершамі, не была знойдзена». Яму не давялося ўбачыць свае паэтычныя зборнікі «На сурмах баравых» і «Барвовая зара», якія былі выдадзены пасля вайны, не давялося адчуць «шчасця першай кнігі».

Аднапалчане, пабрацімы Міколы Сурначова пісалі: «Над магілай свайго друга мы пакляліся адпомсціць ворагам за яго смерць. Сваё слова мы стрымалі... Жывыя натхнёныя словы паэзіі Сурначова, яго баявыя песні, якія ён тварыў пад гукі мін і снарадаў, будуць жыць вечна ў нашых сэрцах...».

Не памыліліся баявыя сябры паэта. Яго вершы — своеасаблівы паэтычны летапіс Вялікай Айчыннай вайны — жывуць і хвалююць нашы сэрцы. Асаблівую вядомасць набыў верш «У стоптаным жыце».

**Другі** —

Ніколі не ехаць
Хлапцу маладому
Да блізкага гаю,
Да роднага дому.
Над ім асыпаюцца
Слуцкія краскі,
Абсмалены колас
Схіліўся да каскі.
Ляжыць ён, як віцязь,
У стоптаным жыце.
Маці спаткаеце —
Ёй не кажыце.

**Першы** — Многія вершы, напісаныя пад «гукі мін і снарадаў», гучаць як сардэчныя салдацкія пісьмы з вайны, адрасаваныя Беларусі, маці, каханай дзяўчыне.

**Другі** —

Ля хаціны тваёй сасновай
Скрозь байцы ў шынялях, бушлатах.
Маці!
Стрэнь іх там добрым словам,
Пачастуй, чым наш край багаты.
Ведай, родная маці,—
Дзеці
Пакідаюць свае дубровы,
Сенам пахнучыя павеці,

Водар пасек сваіх ліпнёвых,
Недаспелую канюшыну,
І жыты, як чарот, густыя,
І адзіную ў свеце дзяўчыну,
І юнацтва сны залатыя.

Можа стацца,
Ад кулі злое
Злягуць многія ў час атакі,
На акопах і буераках
Адцвіце іх жыццё маладое.

Ты пакрый іх павекі,
Мятай
Усцялі іх магілы-курганы
І паплач, як над сынам чаканым,
Майскай раніцай сіняватай.

**Першы** — вершы Міколы Сурначова раскрываюць ўнутраны свет чалавека на вайне. У іх гучаць словы помсты.

**Другі** —

Ты стаптаў нашчэнт мае сады,
Папаліў, развеяў гарады,
Наша шчасце — наш калгасны дом
Затапіў ты горкім палыном.
Я табе спакою, гад, не дам,—
Чорнай кроўю ты адкажаш нам!

**Першы** — З вершаў паэта мы даведаемся, як ён журыўся па айчыне.

**Другі** —

Старонка мая, у смутку
Ты сына свайго не кляні!
Мне ў кожным лясным закутку
Сняцца твае кляны,
Хваёвыя пералескі,
Кветак мядзвяны пах,
Узняўшыя снег пралескі
Як зараз стаяць у вачах.

**Вядучы** — Аляксей Коршак пачаў пісаць вершы яшчэ ў школе. Яны былі радаснымі, наскрозь вясновымі: «Таварыш мой, вялікае ёсць шчасце быць сябрам сонца, песні і вясны...»

**Трэці** — Паэт нарадзіўся на Случчыне ў вёсцы Вуглы 22 лютага 1920 года. У 1941 годзе закончыў літфак Мінскага

педінстытута. Падрыхтаваў да друку зборнік «Пялёсткі», але пачалася вайна. Рукапіс захаваўся ў бацькоў і ўбачыў свет толькі ў 1963 годзе. Сябры папоўнілі яго вершамі ваеннага часу і назвалі — «Апаленыя пялёсткі».

Калі пачалася вайна, Аляксей, як і ўсе юнакі яго ўзросту, стаў салдатам. Ён быў разведчыкам Савецкай Арміі. Суровы час нямнога данёс да нас вершаў маладога паэта, якія пісаліся ў кароткія перадышкі паміж баямі. У іх, нешматлікіх, відаць светлая юнацкая душа паэта-воіна.

**Чацвёрты —**

Часам зморыцца думка ад грымотаў і бітваў,
Ад крыві чалавечай, што навокал праліта.
Стукне сэрца ў грудзёх так: цішыні б і спакою,
Як у вечар ліпнёвы над азёрнай вадою.
І паўстануць у думках — і каханае вочы,
І спатканні й растанні ў салаўіныя ночы,
І юнацкія мары, і гарэзныя ўсмешкі,
І да самага сэрца залацістыя сцежкі.

**Трэці** — 25-ты год пайшоў Аляксею Коршаку, калі падкасіла яго сустрэчная чарга з аўтамата ва Усходняй Прусіі, дзе ён і пахаваны каля паселішча Ласлейндорф. Здарылася гэта 27 лютага 1945 года. Як рэквіем самому сабе гучыць адзін з апошніх вершаў паэта «Паранены».

**Чацвёрты —**

От і усё. За светлы край азёрны,
За вясну ў палёх,
Неба сіняе ў кроплях зорных
Я навек тут лёг.
Нада мной шуміць ракіта кволая,
Пада мной трава.
Сыплецца на сэрца невясёлая
Злой тугі жарства.
Бачу неба сіняе і блізкае
У астатні раз.
Меншыцца яно, маланкай бліскае,
Пачарнела ўраз.
Дзесьці плача кнігаўка... Ці маці...
Мама, бліжай сядзь.
Хочу глянуць, хоць крыху абняці —
Галавы не ўзняць.
Што ж ты не прытулішся, матуля?

На мяне хоць глянь,—
Гіне сын героем твой ад кулі,
Каб квітнела рань.

**Вядучы** — У час баёў пад Масквой, у паходах, на прывалах байцы чыталі на старонках «Комсомольской правды» вершы, падпісаныя «Палітрук Аляксандр Сінічкін». Гэта было сапраўднае прозвішча нашага беларускага паэта Алеся Жаўрука.

**Пяты** — Алесь Жаўрук быў родам з Віцебшчыны. Нарадзіўся 19 жніўня 1910 г. у г. Сянно. Скончыў Рагачоўскі педтэхнікум, затым Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Г. Чарнышэўскага, займаўся ў аспірантуры пры Акадэміі навук БССР. З 1939 года ў Чырвонай Арміі, быў ваенным карэспандэнтам. У час вайны пайшоў на фронт. Загінуў 23 жніўня 1942 г. пад Сталінградам.

Друкавацца Алесь Жаўрук пачаў у 1926 г., да вайны выйшлі два зборнікі «Ручаіны» (1936 г.) і «Дняпро выходзіць з берагоў» (1938 г.).

Знамянальнай з'явай у беларускай паэзіі 30-х гадоў стала яго паэма «Рагачоўскі сшытак». Праз два гады пасля нараджэння Алеся бацькі яго пераехалі з Сянно ў Рагачоў, дзе і прайшлі юначыя гады паэта. «...З гонарам пра родны свой зялёны горад Рагачоў» і расказвае ён у паэме:

**Шосты** —

Ціхім ранкам пад напевам лёгкім
Над вадою шэпчуцца сады.
Ціхім ранкам у прасцяг далёкі
Я прайду, задумны й малады.
Між сланечнікаў праз палісаднік
Пракладу шырокі росны след,
Лодачнік,
Заядлы галубятнік
І вясёлы на зямлі паэт.
І аднойчы вечарам лагодным
У гасцях у дальніх землякоў
Раскажу я з гонарам
　　　　　　　　　　пра родны
Свой зялёны горад Рагачоў.

**Пяты** — Будучы студэнтам, Жаўрук напісаў яшчэ адну паэму — «Крывёю сэрца», прысвечаную барацьбе іспанскага народа з фашызмам. І так сталася затым, што ў баях пад

Сталінградам яму прыйшлося ваяваць з мужным сынам іспанскага народа Ібаруры і загінуць разам з ім.

У час вайны Алесь Жаўрук нямнога паспеў напісаць. Засталося некалькі вершаў, франтавых запісаў, лісты да родных і блізкіх. Характэрныя іх рысы — аптымістычнасць, любоў да Радзімы, вера ў нашу вялікую будучыню.

**Шосты** —

Так заўжды хвілінамі цяжкімі
Саграваеш ты, Радзіма, нас
Зор сваіх святлом, вялікім імем,
Шчыраю парадай у добры час!
Вестачкай паштоўкі нечаканай,
Пачкам папярос, здалёк прысланым,
Песняю сардэчнаю сваёй,
Проста думкай аб табе адной.

**Вядучы** — У 1928 годзе малады беларускі паэт Змітрок Астапенка атрымаў ад Якуба Коласа кнігу з надпісам, у якім была выказана ўпэўненасць, што ён будзе вялікім паэтам. Паэт многае ўспеў напісаць за свой кароткі век.

**Сёмы** — нарадзіўся Змітрок Астапенка 10 лістапада 1910 года на Смаленшчыне. Пасля заканчэння Мсціслаўскага педтэхнікума (у 1929 годзе) працаваў у Мінску ў рэдакцыях газет і часопісаў. Друкаваўся з 1929 года. Да вайны выйшлі кнігі вершаў «На ўсход сонца» (1931), «Краіне» (1931), «Абураныя» (1932). Ён таксама аўтар вершаванай кнігі для дзяцей «Трактар» (1933), навукова-фантастычнага рамана «Вызваленне сіл».

У час вайны З. Астапенка быў напраўлены са спецыяльным заданнем у варожы тыл. Перад адлётам напісаў паэму «Эдэм», якая стала адным з найбольш значных эпічных твораў у савецкай паэзіі.

Да ваеннай пары належыць і цыкл вершаў «Спаленая вёска».

У паэзіі Змітрака Астапенкі, у яго лірычным героі ўвасобіліся тыповыя рысы яго пакалення, на долю якога выпала цяжкае выпрабаванне агнём. Спачатку гэта ўлюбёны ў жыццё, акрылены юнак, перад якім нязведаныя дарогі.

**Восьмы** —

На белым пагорку
Мы гуртам юнацтва страчалі,
Курылі махорку,

Смяяліся ў ясныя далі.
На сонца, на зоры,
На цёмныя пушчы глядзелі,
У лясныя азёры
Кідаліся з белай адмелі,
З юнацкіх гасцёвак
На шлях выбягалі шырокі.
Між сцежак жыццёвых
Сабе выбіралі дарогі.

**Сёмы** — Але, калі на долю маладых, гаворачы словамі паэта, «прыпалі вайна і пажары», то іншым стаў і яго лірычны герой.

**Восьмы** —

Той, хто вырас на гэтай зямлі,
Хто ўсмактаў яе цяжкія сокі,—
Ведай: час і пара падыйшлі
На геройства, на подзвіг высокі.
І цяпер, калі грому гармат
Кулямёт падпявае па-брацку,
Успомні брата забітага, брат,
Успомні, сын, скатаванага бацьку!

**Сёмы** — 7 кастрычніка 1944 года Астапенка пісаў сваім родным: «Напэўна, пасля гэтага пісьма я надоўга не буду мець магчымасці напісаць вам. Хай вас гэта не бянтэжыць... Зараз іду пешкі ў горы, насустрач небяспецы, у агонь барацьбы. Я ні капелькі не баюся небяспекі, ненавіжу ворага, люблю вас, мае родныя. Чакайце».

Гэта было апошняе пісьмо паэта. Як паведаміў Краснапрэсненскі ваенкамат Масквы яго жонцы, «Дзмітрый Емяльянавіч Астапенка, знаходзячыся на фронце, прапаў без вестак у кастрычніку 1944 года». Ёсць меркаванне, што гэта здарылася ў Татрах у Славакіі.

**Вядучы** — У час вайны нашу Беларусь назвалі рэспублікай-партызанкай. І гэта было не выпадкова. Партызаны займалі шэсцьдзесят працэнтаў тэрыторыі Беларусі. Партызанамі былі многія пісьменнікі і паэты і сярод іх Алесь Дубровіч.

**Дзевяты** — Яго сапраўднае прозвішча — Аляксей Рэдзька. Нарадзіўся ў 1910 годзе ў вёсцы Галубічы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў школу, займаўся самаадукацыяй. Актыўна ўдзельнічаў у вызваленчым руху Заходняй Беларусі. У дупле старога дуба, што стаяў ля дарогі з вёскі

Каралевічы на Замошша, хаваў малады паэт рэвалюцыйныя лістоўкі і свае вершы. Лічаць, што паходжанне псеўданіма паэта звязана з тым векавечным дрэвам ля дарогі. У яго вершах той пары знайшла сваё мастацкае адлюстраванне пакутная доля прыгнечанай вёскі Заходняй Беларусі.

**Дзесяты** —

Зелянее на сонцы пад плотам
І шапоча маркотна крапіва,
А на вёсцы — нядоля, бядота,
Нашы людзі жывуць нешчасліва.
Зачарсцвелага хлеба скарынка
Часта ўпрочкі ідзе ад абеду.
Доўга ў місцы малая крупінка
Усё гарцуе, не робячы следу.
Перад лыжкай павернецца крута,
Быццам дробная рыбка з-пад сеці,
І лавіць яе гэтак — пакута,
Нездарма — замарнелыя дзеці.
І шапоча маркотна крапіва
Пад вясновага сонца праменнем:
Гэты позірк галодны, скваплівы
Адшукаў яе, нібы збавенне.
Заўтра справяць галодныя дзеці
Па вясне зноў памінкі крапівай:
Весялей будуць вочы глядзеці,
З-пад рукі выглядаючы жніва.

**Дзевяты** — Светлай верай у вызваленне, у лепшае заўтра пранізаны ўсе вершы Алеся Дубровіча.

**Дзесяты** —

Мы — скрыўджаных няпраўдай струны,
Адным распалены агнём.
Мы гімн пакуце граем сумны
І славу барацьбе пяём.
Натхненне наша ў змаганні
За шчасце новага жыцця,
Мы летуцім аб светлым ранні,
І шмат у песнях пачуцця.
Мы сэрцам полымным і чыстым
Асвецім шлях сябрам другім
І верым: песняй урачыстай
Мы перамозе зложым гімн.

**Дзевяты** — У 1934 годзе Алесь Дубровіч быў арыштаваны і адбыў два гады ў Віленскай турме на Лукішках. Там ён змяшчаў свае вершы пад псеўданімам Макар у рукапісным часопісе палітвязняў «Краты», дзе друкаваліся П. Пестрак, В. Таўлай, М. Танк.

Калі Заходняя Беларусь была вызвалена, землякі выбралі паэта старшынёй сельсавета. Але хутка грымнула вайна, і зноў падполле. Фашысты арыштавалі Алеся, двух яго братоў і бацьку і ў снежні 1944 года расстралялі на вачах у родных.

**Вядучы** — Толькі пра пецярых беларускіх паэтаў, якія аддалі сваё жыццё за Савецкую Радзіму ў час Вялікай Айчыннай, мы расказалі вам сёння. А іх было шмат. Разам з тымі, хто ўжо ўспеў заявіць пра сябе ў літаратуры, якіх мы называлі ў пачатку, загінулі і тыя, хто толькі спрабаваў свой голас — Тодар Курбацкі, Алесь Радзівонаў, Уладзімір Ясючэня. Сярод іх і пісьменнікі з Беларусі, якія пісалі на рускай і яўрэйскай мовах — Эля Каган, Леў Талалай, Іван Шапавалаў і інш. Вершы многіх з іх увайшлі ў зборнік «Крывёю сэрца», які выйшаў на беларускай і рускай мовах. Памяці беларускіх паэтаў, загінуўшых на вайне, бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР прысвяціла невялікую кніжку «Радзіме — радок і жыццё», дзе змешчана многа цікавых матэрыялаў пра іх.

У паэта-франтавіка з гэтай жа плеяды Андрэя Ушакова ёсць такія радкі:

Навекі, як вобраз бацькоў сваіх,
Імёны іх пачытай і запомні.
Ты пройдзеш па полі, па сцежках лясных,
Праз ціхі вечар і ясныя промні.
Каб даць спакой здранцвелым нагам,
Прысядзеш спачыць у цяньку пад вязам,
І, можа, будзе зусім няўцям
Як многаму ім ты ў жыцці абавязан!

Гэтыя крывёю напісаныя радкі можна паставіць эпіграфам да жыцця і творчасці ўсіх беларускіх паэтаў, загінуўшых у баях за Радзіму, якія далі нам важны ўрок грамадзянскасці, сумленнасці, душэўнай чысціні.

# ТРЫВОГІ І НАДЗЕІ ЧАСУ — ТРЫВОГІ І НАДЗЕІ ПАЭТА

(Матэрыял да вуснага часопіса, прысвечанага творчасці народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі)

Вострае пачуццё сучаснасці і шчодры талент, высокая адказнасць перад народам за сваё паэтычнае слова, цесная сувязь з роднай беларускай зямлёй ставяць Пімена Панчанку ўпоравень з буйнейшымі майстрамі савецкай паэзіі. Яго творчасць — гэта «тая невычэрпная крыніца натхнення, якая можа струменіць толькі з сэрца вялікага і чыстага, як родная зямля, з сэрца, якое здольна ўмясціць радасць, шчасце, боль і гора мільёнаў»*. П. Панчанка з'яўляецца лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы за паэму «Патрыятычная песня» (1959 г.), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы за кнігу вершаў «Пры святле маланак» (1967 г.), Дзяржаўнай прэміі СССР за кнігу вершаў «Дзе начуе жаваронак» (1981 г.).

Вусны часопіс, прысвечаны творчасці П. Панчанкі, можна прызначыць да 70-годдзя з дня нараджэння паэта, якое спаўняецца 23 жніўня 1987 года. Новыя вершы, якія з'яўляюцца сёння на старонках часопісаў і газет, сведчаць аб тым, што Пімен Панчанка ў росквіце творчых сіл.

Адкрыць вусны часопіс можна гутаркай аб жыццёвым і творчым шляху П. Панчанкі, зрабіць невялікі агляд яго твораў. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на творы, удастоеныя прэмій. Яго ж старонкі прысвячаюцца асобным, найбольш важным тэмам у творчасці паэта і называюцца радкамі з вершаў.

**І старонка.**

Беларусь, я твой воін адданы і сын,
Мае думкі і сэрца заўсёды з табою.

Тэма Радзімы, тэма Беларусі на ўсіх этапах творчасці П. Панчанкі з'яўляецца галоўнай, непраходзячай, яна чуецца нават у вершах аб загранiцы. Гэтай тэмай вывяраецца ўсё, што адбываецца ў жыцці. Ёй і прысвячаецца старонка часопіса.

* Гілевіч Н. Іменем чалавечнасці //Панчанка П. Размова з наследнікамі. Мн., 1967. С. 5.

Вершы для мастацкага чытання: «Радзіме», «Беларусі», «Кожны з нас прыпасае Радзімы куток», «Родная мова», «Зямля бацькоў», «Зорны час Беларусі»*.

**II старонка.**

Пяць франтоў мяне пылам гарачым абсыпалі,
За вайну перамераны тысячы вёрст.

На гэтай старонцы трэба расказаць пра апаленую агнём і порахам паэзію П. Панчанкі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Тэма вайны хвалюе паэта і сёння і з новай сілай гучыць у яго сучасных вершах. «Плача тоненькі, тоненькі ў сэрцы голас вайны»,— піша Панчанка ў адным з іх.

Вершы для мастацкага чытання

«Змагайцеся адважна за Радзіму!», «Дзеці вайны», «Сінія касачы», «Іх вечныя агні», «Калі пачалася вайна для мяне?», «Агонь».

**III старонка.**

Я бачыў землі шчасця і пакут,
Іх лёс — іх шлях цяпер мяне трывожыць.

У пасляваенныя гады П. Панчанка многа падарожнічае. Іран, Фінляндыя, Данія, Бельгія, Францыя, ЗША, Італія, Грэцыя, Турцыя, Канада, Туніс, Алжыр, Сенегал, Югаславія, Польшча і іншыя замежныя краіны давялося наведаць паэту. Уражанні аб загранiцы выліліся ў шматлікія вершы. На трэцяй старонцы пойдзе гутарка пра вершы гэтай тэматыкі, якая на доўгі час стала для П. Панчанкі сваёй, арганічнай. Тут асабліва важна паказаць, што гэтыя вершы пазбаўлены таннай турысцкай экзотыкі, яны напоўнены пафасам палымянага савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Вершы для мастацкага чытання

«Амерыцы», «Свята ў Палерма», «Руіны Карфагена», «Мы першы раз за межамі Радзімы», «У Тэгеране», «У Польшчы», «Глыток Афрыкі і інш.

**IV старонка.**

...трэба нам пакінуць наследнікам навек
Праўдзівую краіну між салаўіных рэк.

---

* Вершы прыводзяцца па выданні: Панчанка П. Зб. тв. у 4-х т.— Т. 1—4.— Мн., 1981—1983.

Апошнюю старонку часопіса можна прысвяціць лірычнай тэме ў творчасці П. Панчанкі, для якой уласціва абвостранае пачуццё часу і звязанае з ім пачуццё адказнасці за свой час і за сваіх сучаснікаў. Паэта займае жыццё ва ўсёй яго складанасці, ён змагаецца за чалавечнае ў чалавеку. З замілаваннем апісваючы прыроду роднага краю, ён разам з тым непакоіцца аб тым, што мы пакінем будучым пакаленням, таму што чалавек сёння ў адказе за лёс і будучыню ўсёй планеты.

### Вершы для мастацкага чытання

«У родных месцах», «Бяроза», «Дождж ідзе прамяністы і дробны...», «Лінія высокага напружання», «Чалавечнасць», «Пры святле маланак», «Дзень той прапаў і страчаны навекі», «Колькі той радасці ў чалавека» і інш.

### Літаратура


**Гапава В. І.** Пімен Панчанка.— М., 1977.— 24 с.

**Бярозкін Р.** Пімен Панчанка: Крытыка-біягр. нарыс.— Мн.: Беларусь, 1968.— 231 с.

**Бечык В.** Хваляваціа за ўсіх і ўсё... //Бечык В. Прад высокаю красою. Мн., 1984. С. 39—66.

**Быкаў В.** Паэзія дабрыні і мужнасці //Быкаў В. Праўдай адзінай. Мн., 1984. С. 199—203.

**Вярцінскі А.** Аб жыцці, аб людзях, аб сабе //Вярцінскі А. Высокае неба ідэала. Мн., 1980.С.77—84.

**Скобелеў Э.** Сцвярджэнне праўды //Маладосць. 1985. № 7. С. 157—164.

**Стральцоў М. Л.** Разам з людзьмі //Стральцоў М. Л. Пячатка майстра. Мн., 1986. С. 77—88.


## УСІМІ ФАРБАМІ ЖЫЦЦЯ

(Матэрыял да канферэнцыі чытачоў па творчасці Я. Брыля)

Цікавая і незвычайная творчасць Янкі Брыля разлічана на ўважлівага, удумлівага і дапытлівага чытача, патрабуе ад яго напружанай думкі, непаспешлівых разваг і роздуму. Творы пісьменніка населены непаўторнымі чалавечымі характарамі, у якіх апаэтызаваны людзі з народу. Як гаворыць сам пісьменнік, вышэй за ўсё і перш за ўсё ў жыцці ён лічыць чалавечнасць.

Канферэнцыю чытачоў па творчасці Я. Брыля можна прызначыць да 70-годдзя пісьменніка, якое будзе адзначацца

4 жніўня 1987 года. Яе можна правесці са старшакласнікамі, якія пазнаёміліся з творчасцю Я. Брыля як на ўроках літаратуры, так і ў пазакласным чытанні.

### Прыкладныя пытанні

1. Працоўная і непахісная ў найцяжэйшых выпрабаваннях родная Беларусь — важнейшая тэма ў творчасці Я. Брыля.

2. Героі твораў Я. Брыля — людзі рознага ўзросту, вопыту, з рознымі схільнасцямі, характарамі, поглядамі на жыццё. Якія з іх больш за ўсё спадабаліся вам, уразілі сваімі душэўнымі якасцямі?

3. Абагульнены вобраз беларускай жанчыны-маці ў рамане «Птушкі і гнёзды», апавяданнях «Маці», «Ты жывеш», «У сям'і» і інш.

4. Своеасаблівае асэнсаванне падзей вайны ў творчасці пісьменніка, у чым яно выражаецца?

5. Праяўленне асобы пісьменніка ў яго творах. Адносіны Я. Брыля да сваёй складанай і адказнай літаратурнай працы ў яго пісьменніцкіх роздумах «Жменя сонечных промняў», «Вітражы», «Роздум і слова».

6. Векавая і справядлівая мудрасць народа, квяцісты вясковы быт, пейзажныя замалёўкі, невычэрпна багатая мова ў творах Я. Брыля.

### Літаратура


**Гусева Л. Н.** Брыль-мастак.— Мн.: Выш. шк., 1968.— 160 с.

**Каваленка В.** Людзі і Радзіма //Іменем чалавечнасці. Мн., 1986. С. 174—182.

**Калеснік У.** Здымак у жыцце //Калеснік У. Лёсам пазнанае. Мн., 1982. С. 377—441.

**Миско Я. Г.** Людям на счастье //Міско Я. Г. Маё маўклівае сэрца. Мн., 1983. С. 410—414.

**Стральцоў М. Л.** Служэнне //Стральцоў М. Л. Пячатка майстра. Мн., 1986. С. 66—77.

**Акудович В.** Быть собеседником //Неман. 1985. № 1. С. 163—166.


## ПТАШНІКАЎ І. АЛІМПІЯДА. ВОБЛАКІ ШАСЦІДЗЕСЯТЫХ:

Раман.— Мн.: Маст. літ., 1985.— 623 с.

(Матэрыял да абмеркавання)

Як адзначаецца ў пасляслоўі Г. Шупенькі да новага твора І. Пташнікава «Алімпіяда», гэты раман — падзея ў нашай

мастацкай прозе, адзін з лепшых раманаў ва ўсёй гісторыі беларускай літаратуры. У ім усё натуральнае, як у жыцці: жывыя людзі з іх радасцямі і пакутамі, з балючай памяццю вайны, рэальная беларуская зямля з яе палямі, лясамі, дарогамі, сучасная беларуская вёска з яе няхітрым светам сапраўднага харааства і высокага трагізму. Раман «Алімпіяда»— своеасаблівы гімн чалавечай працы, простым чалавечым рукам, няпростым сэрцам людзей з народа, чалавечай дабрыні. Ён можа выклікаць розныя меркаванні і нават спрэчкі. Аб праблемах, узнятых у рамане, будзе цікава пагаварыць пры яго абмеркаванні.

### Пытанні да абмеркавання

— Якія рысы нацыянальнага беларускага характару ўвасоблены ў вобразе Алімпіяды? Яе паняцці дабра, сумленнасці, чалавечнасці.

— Праблемы сучаснай вёскі, узнятыя ў рамане. Сувязі чалавека з зямлёю як адна з найгалоўнейшых з іх.

— Праблема вясковай моладзі.

— Адмоўныя змены, якія спадарожнічаюць глыбокім працэсам у эканамічнай і духоўнай сферы вёскі. Вострае сацыяльнае зло — п'янства. Чаму, на вашу думку, так склаўся лёс леспрамгасаўскага шафёра Фірагі?

— Які ўплыў працягваюць аказваць падзеі вайны на наш сённяшні час?

### Літаратура

**Шупенька Г.** Голасам народа //Маладосць. 1985. № 1. С. 169—173.

**Кучар А.** Рысы героя нашага часу //Літ. і мастацтва. 1984. 25 мая. С. 5—7.

**Марціновіч А.** Паяднанасць з жыццём //Звязда. 1986. 9 студз.

## КУДРАВЕЦ А. САЧЫНЕННЕ НА ВОЛЬНУЮ ТЭМУ:

Раман.— Мн.: Маст. літ., 1985.— 285 с.

(Матэрыял да абмеркавання)

«Сачыненне на вольную тэму» — гэта першы раман таленавітага празаіка. Ён уносіць важкі ўклад у беларускую прозу і заслугоўвае вялікай увагі. У цэнтры рамана — лёс Ігната Сцяпанавіча Вапшчэткі, звычайнага вясковага працаўніка, у якім увасоблены лепшыя якасці народа. Праз народны харак-

тар і народнае жыццё вырашаецца ў рамане адна з актуальнейшых праблем сучаснасці — праблема чалавечнасці. Ён напісаны сакавітай беларускай мовай, прасякнуты добрым і разумным гумарам.

### Пытанні да абмеркавання

— Ігнат Сцяпанавіч — адна з мацнейшых фігур беларускага характару. Якія лепшыя якасці народа сцвярджае яго вобраз?

— Вырашэнне ў рамане адной з актуальнейшых праблем сучаснасці — праблемы чалавечнасці — праз народны характар і народнае разуменне жыцця.

— Процiборства Ігната Сцяпанавіча са Стасем Мастоўскім — сутыкненне двух розных поглядаў на жыццё, на сэнс чалавечага існавання. Чаму, на вашу думку, у адной кампаніі з Мастоўскім аказаўся Любамір?

— Як вы разумееце прынцып жыцця Ігната Сцяпанавіча «Кожны павінен мець у душы дысцыпліну і ніхто не вольна рушыць яе. Чалавек без дысцыпліны — ніжэйшая інстанцыя, бо ніякіх рэсурсаў не мае». Ці заўсёды ён сам быў верны гэтаму прынцыпу? А як жа яго каханне да Полі?

— Чаму вучыць нас багаты і павучальны жыццёвы вопыт Ігната Сцяпанавіча? Як жыць, у што верыць, чым кіравацца ў сучасным складаным свеце?

— Які сэнс укладзены аўтарам у назву рамана?

### Літаратура

**Савік Л.** Эфект прысутнасці //Полымя. 1985. № 11. С. 214—216.

**Сідарэвіч А.** Новая сустрэча з Ігнатам Сцяпанавічам //Маладосць. 1985. № 10. С. 170—173.

**Грамадчанка Т.** Невычарпальнасць характару //Літ. і мастацтва. 1985. 18 студз. С. 6—7.

**Скобелеў Э.** Вобразы глыбокія, шматгранныя. //Звязда. 1985. 12 сак.

## АЛЕКСІЕВІЧ С. У ВАЙНЫ — НЕ ЖАНОЧЫ ТВАР...

Мн.: Маст. літ., 1985.— 317 с.

(Матэрыял да ўрока мужнасці)

Чатыры гады запісвала С. Алексіевіч успаміны жанчынфрантавічак, партызанак і падпольшчыц пра самую страшную вайну XX стагоддзя — Вялікую Айчынную. Іх расказы,

а таксама асабістыя пачуцці, сумненні, пошукі аўтара пакладзены ў аснову кнігі «У вайны — не жаночы твар...» Сярод яе гераінь не славутыя снайперы і не праслаўленыя лётчыцы, пра якіх ужо нямала напісана, а звычайныя дзяўчаты, якіх было многа. Іх успаміны — гэта не толькі сведчанне масавага гераізму савецкіх жанчын на вайне, але і абвінавачванне фашызму ўчарашняга, сённяшняга, будучага. З кнігі паўстае новае аблічча мінулай вайны, якой яна захавалася ў эмацыянальнай жаночай памяці. Як гаворыць у прадмове С. Алексіевіч, у кнізе мала ваеннага і спецыяльнага матэрыялу, але многа матэрыялу чалавечага, які і забяспечыў перамогу савецкага народа над фашызмам.

Пры падрыхтоўцы да ўрока мужнасці па кнізе С. Алексіевіч «У вайны — не жаночы твар...» бібліятэка павінна перш за ўсё выявіць, ці ёсць сярод гераінь кнігі такія, якія так ці інакш звязаны з краем (нарадзіліся, ваявалі, ці зараз жывуць), наладзіць з імі кантакты, запрасіць прыняць удзел у мерапрыемстве. Рэкамендуем даць дамашняе заданне ўдзельнікам урока — адшукаць у сваім горадзе, раёне, вёсцы жанчын-удзельніц вайны, запісаць іх успаміны. Пазней іх можна выкарыстаць пры правядзенні ўрока, арганізаваць выстаўку запісаў ці конкурс на лепшы з іх. Некаторых жанчын трэба таксама запрасіць на ўрок, папрасіць іх выступіць.

Эмацыянальнае ўздзеянне ўрока павысіцца, калі на ім прагучаць патрыятычныя вершы і песні пра вайну. Бібліятэка павінна падабраць іх, падрыхтаваць чытальнікаў і выканаўцаў. Неабходна выкарыстаць таксама ўрыўкі з цыкла дакументальных фільмаў В. Дашука «У вайны — не жаночы твар», створанага на аснове кнігі.

С. Алексіевіч запісала расказы 500 жанчын. Так як на ўроку немагчыма расказаць пра ўсіх, можна спыніцца на лёсе некаторых з іх. Лепш за ўсё, калі гэта будуць тыя ж гераіні, якіх паказаў у сваім фільме В. Дашук. Гэта дасць магчымасць дапоўніць расказ пра іх ваенны і сённяшні лёс дэманстрацыяй урыўкаў з фільма.

Увагу ўдзельнікаў урока неабходна сканцэнтраваць на тэмах мужнасці, сумлення, пакут, барацьбы, кахання. Пры гэтым трэба падкрэсліць, што перанесеныя выпрабаванні не зрабілі жанчын жорсткімі, помслівымі, наадварот, вайна абвастрыла ў іх здольнасць адчуваць чужы боль як свой, у поўнай меры праявіла іх вялікае сумленне, міласэрнасць.

## План урока мужнасці

### 1. У гераічнага — тысяча твараў

Выступленне вядучага з расказам пра ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне савецкіх жанчын, трымаўшых на сваіх плячах тыл і абараняўшых Айчыну разам з мужчынамі. Асаблівую ўвагу звярнуць на матэрыялы мясцовага характару, выкарыстаць запісы, якія зрабілі ўдзельнікі ўрока.

### 2. Мы і радзіма — для нас гэта было адно і тое ж

Дакументальна-мастацкая кампазіцыя ці расказ пра лёс гераінь кнігі С. Алексіевіч «У вайны — не жаночы твар...» з паказам урыўкаў з аднайменнага фільма, з выкананнем вершаў і песень пра вайну.

### 3. Калі б мы ні нарадзіліся, але ўсе мы нарадзіліся ў сорак першым

Выступленне ўдзельніц Вялікай Айчыннай вайны, а калі магчыма, то і гераінь кнігі.

### 4. Чатыры гады і «маёй» вайны

Расказ пра аўтара кнігі, якая чатыры гады ішла «апаленымі кіламетрамі чужога болю і памяці», запісала сотні ўспамінаў жанчын-удзельніц вайны, выступленні ўдзельнікаў урока з расказам пра тое, якое ўражанне на іх аказала кніга, лёс яе гераінь, пра іх асабістае ўспрыманне падзей Вялікай Айчыннай вайны.

## Літаратура

**Зеленский В. А.** В одном строю.— Мн.: Беларусь, 1980.— 222 с.

**За цябе**, Радзіма.— Мн.: Юнацтва, 1984.— 175 с.

**Нам** зброю Радзіма скавала //Такія сэрцы у нас.— Мн., 1980. С. 114—199.

**Лаврецкий В.** Женская память о минувшей войне //Во славу Родины. 1985, 22 июня.

**Маслоўская В.** Урок маральнасці //Літ. і мастацтва. 1984. 4 мая. С. 5.

**Тихонович К.** «Да» — миру, «нет» — смерти //Сел. газ. 1984. 8 мая.

**Арлова Т.** У вайны не жаночае аблічча //Работніца і сялянка. 1983. № 6. С. 14—15.

## ЛІТАРАТУРНАЯ ВІКТАРЫНА

### Беларуская дакастрычніцкая літаратура

1. Да якога году адносіцца першае ўпамінанне пра паэму «Энеіда навыварат?» Дзе і калі яна была надрукавана? (Да 1842 г., у рускім часопісе «Маяк», у 1845 г.).

2. Каму прыпісвалася аўтарства паэмы «Тарас на Парнасе»? (В. Дуніну-Марцінкевічу, А. Вярыгу-Дарэўскаму, студэнтам Горы-Горацкага земляробчага інстытута).

3. Першы твор В. Дуніна-Марцінкевіча. Калі ён быў апублікаваны? (П'еса «Ідылія», у 1846 г.).

4. Пад якім псеўданімам выпусціў першую кніжку вершаў Ф. Багушэвіч? Як яна называлася? (Мацей Бурачок, «Дудка беларуская»).

5. Пяру якога паэта належыць абразок «З крывавых дзён», у якім расказваецца аб падзеях 1863 г. у Мінску і Мінскай губерні? (Янку Лучыну).

6. Якой беларускай паэтэсай падрыхтаваны падручнік-хрэстаматыя «Першае чытанне для дзетак-беларусаў»? (Цёткай).

7. Беларускі паэт канца XIX ст., спачатку член, а затым кіраўнік рэвалюцыйнага «Гуртка моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларускай». (Адам Гурыновіч).

8. Рамантычныя паэмы Янкі Купалы, фабулы якіх падказаны паэту народнай творчасцю. («Курган», «Бандароўна», «Магіла льва»).

9. Рэдактарам і выдаўцом якой газеты быў Янка Купала? Калі і дзе яна выдавалася? («Наша ніва», у 1906—1915 гг., у Вільні).

10. Якія беларускія пісьменнікі друкавалі свае творы ў «Нашай ніве»? (Я. Купала, Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч, Ц. Гартны, З. Бядуля, А. Гурло, К. Буйло і інш.).

11. Першы зборнік вершаў Якуба Коласа, калі і дзе ён выйшаў? («Песні-жальбы», у 1910 г., у Вільні).

12. Над якім цыклам апавяданняў працаваў Я. Колас да канца жыцця і лічыў яго цэласным творам? Калі зборнік быў выдадзены ўпершыню? («Казкі жыцця», у 1921 г.).

13. Героіка-рамантычная паэма М. Багдановіча. («Страцім-лебедзь»).

14. Творы якіх антычных і заходнееўрапейскіх аўтараў перакладаў М. Багдановіч? (Гарацыя, Авідзія, Г. Гейне, Ф. Шылера, П. Верлена, Э. Верхарна і інш.).

15. Аўтар аднаго з першых твораў буйнога эпічнага жанру ў беларускай літаратуры, рамана «Золата»? (Ядвігін Ш.).

16. Першы зборнік З. Бядулі? («Абразкі»).

17. Дакументальныя запіскі беларускага пісьменніка пра імперыялістычную вайну? («На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага).

### Беларуская савецкая літаратура

1. Першая беларуская літаратурна-творчая арганізацыя, калі і па чыёй ініцыятыве яна была створана? (Літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», у 1923 г., ЦК камсамола Беларусі).

2. Заснавальнікі гэтага аб'яднання? (М. Чарот, А. Дудар, Я. Пушча, А. Александровіч, А. Вольны).

3. Да якой падзеі быў напісаны верш Я. Купалы «Беларусі ордэнаноснай». (Да дня ўручэння рэспубліцы ордэна Леніна).

4. За якімі вершамі Я. Купалы замацавалася назва «ляўкоўскі цыкл»? (За вершамі, напісанымі ў час знаходжання на дачы ў Ляўках у чэрвені—жніўні 1935 г.).

5. У якім годзе і ў сувязі з чым Я. Коласу прысвоена званне народнага паэта Беларусі? (У 1926 г., у сувязі з 20-годдзем літаратурнай творчасці і за заслугі ў развіцці беларускай літаратуры).

6. Якое апавяданне Я. Коласа папярэднічала стварэнню паэмы «Новая зямля»? («Як дзядзька ездзіў у Вільню і што ён там убачыў»).

7. З якіх чатырох кніг складаецца раман Ц. Гартнага «Сокі цаліны»? («Бацькава воля», «На перагібе», «Крыжавыя дарогі», «Чырвоныя зарніцы»).

8. Казачная аповесць З. Бядулі. («Сярэбраная табакерка»).

9. Аўтар паэмы «Ленін», аднаго з самых значных дасягненняў даваеннай беларускай Ленініяны. (М. Чарот).

10. Зборнік вершаў У. Дубоўкі, адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Я. Купалы. («Палеская рапсодыя»).

11. Назавіце прыказкі, якія ляжаць у аснове многіх баек К. Крапівы. (У чужое проса не сунь носа («Сука ў збане»), Баба з калёс — калёсам лягчэй («Дзед і баба»), Кожны цыган сваю кабылу хваліць («Пра цыгана і кабылу»), Пнецца як жаба на купіну («Жаба ў каляіне»), Ліслівае цяля дзве маткі ссе («Ліслівае цяля»).

12. Якое літаратурнае аб'яднанне ўзначальваў К. Чорны? («Узвышша»).

13. Апавяданне П. Галавача, стаўшае эскізам будучай аповесці «Спалох на загонах». («Нястрымнае»).

14. Якім падзеям прысвечаны раман Я. Маўра «Амок»? (Рэвалюцыі 1926 г. на інданезійскім востраве Ява).

15. Зборнік М. Лынькова, у які ўвайшлі нататкі, нарысы, апавяданні, напісаныя пасля паездкі ў ЗША. («За акіянам»).

16. Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты Ленінскіх прэмій, за якія творы яны іх удастоены? (П. Броўка за кнігу вершаў і паэм «А дні ідуць...», І. Мележ за раманы «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», М. Танк за зборнік вершаў «Нарачанскія сосны», В. Быкаў за аповесць «Знак бяды»).

17. Дакументальна-гістарычная паэма А. Куляшова. Якія гістарычныя асобы з'яўляюцца яе героямі? («Хамуціус». К. Каліноўскі, В. Урублеўскі, А. Мацкявічус).

18. Народны паэт Беларусі, старшыня Саюза пісьменнікаў рэспублікі. (М. Танк).

19. Які беларускі паэт быў ваенным карэспандэнтам у Іране ў 1944 г.? Цыкл вершаў, які з'явіўся вынікам гэтай паездкі? (П. Панчанка, «Іранскі дзённік»).

20. Аўтабіяграфічныя творы Я. Брыля. («У сям'і», «Сірочы хлеб», «Золак, убачаны здалёк», «Птушкі і гнёзды»).

21. Па якіх творах І. Шамякіна створаны драматычныя спектаклі, тэлефільмы, поўнаметражныя мастацкія фільмы? («Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», «Трывожнае шчасце», «Крыніцы», «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч», «Вазьму твой боль», «Эшалон прайшоў»).

22. Беларускі пісьменнік — акадэмік АН БССР і яе віцэ-прэзідэнт? (І. Навуменка).

## Метадычныя парады па прапагандзе беларускай літаратуры Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна

**Гордасць** і слава беларускай літаратуры: (Да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа).— Мн., 1981.— 77 с.

**Іван Шамякін.** (Да 60-годдзя з дня нараджэння) //Новыя кнігі БССР.— 1890.— № 7.— Дадат.

**Іван Мележ:** (Да 60-годдзя з дня нараджэння) //Новыя кнігі БССР.— 1980. № 9.— Дадат.

**«Человек.** Война. Подвиг». (Материал к читательской конф. по творч. В. Быкова) //Великий подвиг народа. Мн., 1984. С. 16—17.

**Матэрыялы** да абмеркавання аповесці В. Быкава «Знак бяды» //Инструктивно-методические рекомендации к проведению трехдневных город-

ских и районных семинаров культпросветработников и секретарей комсомольских организаций на 1983 г. I кв. Мн., 1983. С. 30—31.

Матэрыялы да канферэнцыі чытачоў па раману І. Шамякіна «Вазьму твой боль» //Новая веха на пути к коммунизму. Мн., 1981. С. 49—50.

Материал к обсуждению романа Э. Скобелева «Катастрофа». //Молодежь и идеологическая борьба. Мн., 1986. С. 41.

## ЗМЕСТ

Прапаганда беларускай літаратуры ў масавых бібліятэках рэспублікі 3

Вывучэнне інтарэсаў чытачоў . . . . . . . . . . 4

Індывідуальная работа . . . . . . . . . . . . 7

Масавая прапаганда . . . . . . . . . . . . 9

Дадатак . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

Нам засталася спадчына. (Матэрыял да вечара беларускага народнага фальклору) . . . . . . . . . . . . . 25

Зямля Беларусі! Табой мы сагрэты... (Матэрыял да літаратурнага вечара) . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

Многаму ім ты ў жыцці абавязан. (Матэрыял да вечара паэзіі) . . 30

Трывогі і надзеі часу — трывогі і надзеі паэта. (Матэрыял да вуснага часопіса, прысвечанага творчасці народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі) . . . . . . . . . . . . . . . . 40

Усімі фарбамі жыцця. (Матэрыял да канферэнцыі чытачоў па творчасці Я. Брыля) . . . . . . . . . . . . . . 42

Пташнікаў І. Алімпіяда. Воблакі шасцідзесятых: Раман. (Матэрыял да абмеркавання) . . . . . . . . . . . . . . 43

Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму: Раман. (Матэрыял да абмеркавання) . . . . . . . . . . . . . . . . 44

Алексіевіч С. У вайны не жаночы твар... (Матэрыял да ўрока мужнасці) 45

Літаратурная віктарына . . . . . . . . . . . . . 48

«Беларуская дакастрычніцкая літаратура» . . . . . . . 48

«Беларуская савецкая літаратура» . . . . . . . . . 49

Метадычныя парады па прапагандзе беларускай літаратуры Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна . . . . . . . . . 50

Составитель Мария Владимировна Сокол

**Пропаганда белорусской литературы в массовых библиотеках республики**

На белорусском языке

Рэдактар М. А. Каваленка
Тэхнічны рэдактар Н. Я. Грычук

Падпісана да друку 8.10.86. АТ 24048. Формат 60х84 1/16. Папера друкарская. Высокі друк. Ум.-друк. арк. 3,02. Ул.-выд. арк. 2,37. Заказ 3673. Тыраж 3000 экз. Бясплатна.

Дзяржбібліятэка БССР імя У. І. Леніна.
220636, Мінск, Чырвонаармейская, 9.
Надрукавана ў друкарні Белсаўпрофа.
220030, Мінск, пл. Свабоды, 23.

Бясплатна